

ВЯСЁЛЫЯ ГІСТОРЫІ ЧЫТАЧОЎ

5

ЛЁС СТАРЫХ ХАТ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 СНЕЖНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 241 (28857)

9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:

«Беларусь разглядае зялёную эканоміку, нізкавугляроднае ўстойлівае развіццё як стратэгічны вектар. Паколькі каля 61 % выкідаў прыпадае на энергетычны сектар, асаблівая ўвага аддаецца павышэнню энергаэфектыўнасці эканомікі, развіццю аднаўляльных і іншых нізкавугляродных крыніц энергіі. Кожная краіна мае нерэалізаваны патэнцыял, які можа і павінен быць задзейнічаны пры прадастаўленні дадатковай падтрымкі. Беларусь гатовая да «павышэння амбіцыйнасці», мы гатовы зрабіць больш у такіх галінах, як энергетыка, транспарт, прамысловасць, будаўніцтва і абыходжанне з адходамі».

ДЗЕД МАРОЗ З МІНУЛАГА СТАГОДДЗЯ

Фота БелТА.

У народным музеі «Гісторыя Заронаўскага краю», што знаходзіцца ў аграгарадку Заронава Віцебскага раёна, захоўваецца багатая калекцыя — больш за тысячу навагодніх цацак і паштовак. Яе сабрала захавальніца музея Людміла НІКІТКІНА з дапамогай вучняў, землякоў і сяброў. Перад навагоднімі святамі экспанаты музея становяцца вельмі папулярныя, асабліва сярод самых маленькіх наведвальнікаў — выхаванцаў мясцовага дзіцячага садка.

КАРАТКА

- **ДАІ заклікае кіроўцаў ва ўмовах галалёдзіцы праяўляць павышаную ўважлівасць на дарогах.**
- У Беларусі правялі першую гібрыдную аперацыю ў галіне кардыяхірургіі.

- **Больш чым на 60 % за пяць гадоў вырас аб'ём вытворчасці мэблі ў краіне.**
- У Беларусі зарэгістравана першае сеткавае выданне — партал sb.by, рэдакцыя якога ўваходзіць у склад Выдавецкага дома «Беларусь сегодня».
- **У Мінску 24 снежня ў тэатралізаваным навагоднім шэсці возьмуць удзел больш за тысячу казачных персанажаў.**

Актуальнае інтэрв'ю

СПАДАРОЖНІК ВЫХОДЗІЦЬ НА АРБІТУ

Чым жыве самы малады горад Беларусі

Фаніпаль — самы малады горад не толькі ў Мінскай вобласці, але і ў краіне. А цяпер стаў і горадам — спадарожнікам сталіцы. Гэтыя абставіны абумовілі яшчэ большы рост і развіццё населенага пункта. Сёння ў Фаніпалі зарэгістравана 16 318 жыхароў. Гэта не канчатковая лічба. Больш дакладную пакажа перапіс насельніцтва, які пройдзе ў наступным годзе. Колькасць жыхароў пастаянна павялічваецца за кошт натуральнага прыросту і міграцыі. Горад знаходзіцца паблізу сталіцы, з якой яго злучае міжнародная аўтатраса М1, чыгунка, кожныя дзесяць хвілін ходзяць маршруткі. Добрыя транспартныя зносіны, забяспечанасць неабходнымі камунікацыямі стварылі ўмовы для размяшчэння сучасных вытворчасцяў. У свабоднай эканамічнай зоне працуе больш за 45 прадпрыемстваў. Што зроблена апошнім часам для камфортнага пражывання гараджан, што яшчэ трэба зрабіць, мы спыталі ў старшыні Фаніпальскага гарвыканкама Уладзіміра КАРАНЕВІЧА.

СТАР. 4

IT-краіна

Медыцынская дапамога... у электронным фармаце

Лічбавая трансфармацыя сістэмы аховы здароўя ахопіць 9,5 мільёна чалавек, у тым ліку 50 тысяч урачоў і 120 тысяч прадстаўнікоў сярэдняга медыцынскага персаналу.

— Такіх маштабных праектаў, як стварэнне электроннай сістэмы аховы здароўя, у гісторыі айчыннай медыцыны яшчэ не рэалізоўвалася, — падкрэслівае **загадчык сектара праграмна-інфармацыйнага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Віктар СІДАРЭНКА.**

У Канцэпцыі развіцця электроннай сістэмы аховы здароўя на перыяд да 2022 года закладзены асноўныя прынцыпы яе пабудовы і магчымасці для інтэграцыі ў агульнадзяржаўную аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму.

— Электронная сістэма аховы здароўя, на нашу думку, адкрывае прынцыпова новыя магчымасці ў развіцці галіны. Яе падмуркам стане электронная медыцынская карта, якая будзе стварацца пры нараджэнні грамадзяніна і папаўняцца актуальнай інфармацыяй на працягу ўсяго яго жыцця, — тлумачыць Віктар Сідарэнка.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

НЕ ТОЛЬКІ ЭКАНОМІКА

Беларусь і Карэлію звязваюць асаблівыя сувязі

Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў гэты ўнікальны ў адносінах прыродных рэсурсаў рэгіён Савецкага Саюза выехала вельмі шмат нашых суайчыннікаў, асабліва жыхароў Баранавіцкага і Маладзечанскага раёнаў, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей. На пачатак 1960 года ў Карэліі пражывала амаль 72 тысячы беларусаў, трошкі менш, чым саміх карэлаў.

Пазней большая частка беларусаў вярнулася, але любоў да гэтай чароўнай паўночнай зямлі людзі захавалі. Як не перасталі любіць Бацькаўшчыну і тыя, хто там застаўся, яны здолелі перадаць асаблівыя пачуцці да Беларусі і сваім дзецям. Нездарма, напрыклад, на Дрыбінскіх таржках ужо традыцыйна ладзіцца карэльскае падвор'е: цягнікамі з перасадкай карэльскія беларусы штогод вязуць у магілёўскі райцэнтр на фестываль нацыянальныя карэльскія стравы. Ды і сённяшні кіраўнік Рэспублікі Карэлія Артур Парфенчыкаў мае беларускія карані — яго бацька адсюль. Усё гэта стварыла асаблівую атмасферу сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Артурам Парфенчыкавым.

Размова заканамерна пачалася з эканамічнага блока. «Супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі з'яўляецца адной з асноў стратэгічных адносін паміж нашымі краінамі і ключавым складнікам гандлёва-эканамічных сувязяў, — сказаў беларускі лідар, вітаючы кіраўніка расійскай дэлегацыі. — Карэлія — важны для нас партнёр у Паўночна-Заходняй федэральнай акрузе. Беларусь зацікаўлена ў далейшым нарошчванні тэмпаў гандлю, прасоўванні дзелавых ініцыятыў, пошуку новых пунктаў росту».

Кіраўнік дзяржавы ў якасці перспектыўнага праекта назваў стварэнне сумеснай зборачнай вытворчасці лесанарыхтоўчай тэхнікі «Амкадор». Яшчэ адзін кірунак супрацоўніцтва — пастаўка беларускіх кар'ерных і грузавых аўтамабіляў для горназдабыўных прадпрыемстваў, тэхнікі для лесапрамысловага комплексу, пасажырскага транспарту, а таксама забеспячэнне іх запаснымі часткамі. Беларусь можа аказаць дапамогу ў развіцці сельскай гаспадаркі Карэліі, у тым ліку пашырыць экспарт прадукцыі айчыннага машынабудавання для гэтых мэт. «Вопыт вялікі: ад Венесуэлы да Сахаліна, — запэўніў Прэзідэнт. — Мы на Сахаліне будуем узорны малочнатаварны комплекс».

Падобны комплекс будуецца ва Узбекістане, такі ж пад ключ плануецца стварыць у Азербайджане. «Аб'ехаўшы ўвесь свет і паспрабаваўшы розныя тэхналогіі, мы прыйшлі да пэўнага выніку — у якім кірунку павінна развівацца сельская гаспадарка. Таму, калі будзе такая патрэба, мы можам аказаць дапамогу і падтрымку», — запэўніў беларускі лідар. Ён таксама адзначыў вялікі патэнцыял супрацоўніцтва вучоных-аграрыяў. «Вам, напэўна, будзе зручна супрацоўнічаць з нашай навукай, бо каштоўнасць яе ў тым, што мы пасля распаду Савецкага Саюза захавалі ўсе кірункі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асобна спыніўся кіраўнік дзяржавы на тэме паставак у Расію прадуктаў харчавання. Зараз шмат вядзецца размоў пра перашкоды для продажу беларускіх прадуктаў на расійскім рынку. «Вы павінны дакладна разумець, што прычына ў звычайнай канкурэнцыі», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Ён прывёў у прыклад абвінавачванні беларусаў у дэмпінгаванні цэн: «Я часта кіраўнікам Расіі кажу: стварыце буйную кампанію, і мы праз яе будзем пастаўляць на ўсю Расію. Мы будзем пастаўляць за рубель, а вы прадавайце за 10, калі лічыце, што расіяне вельмі багатыя. Размова насамрэч пра нядобрасумленную канкурэнцыю. Справа тут зусім не ў якасці». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь у свой час вымушана была павысіць патрабаванні да якасці прадуктаў харчавання, бо пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС нельга было зніжаць планку — размова ішла пра здароўе нацыі, цяпер жа натуральныя прадукты сталі сусветным трэндам.

Прэзідэнт адзначыў неабходнасць дыверсіфікацыі рынкаў збыту і збалансаванасці паставак. «Нам ваш рынак выгадны, бо ён побач. Гэты рынак можна назваць прэміяльным, і мы гатовы да супрацоўніцтва, але такім чынам, каб не парушаць усталяваны баланс, — падкрэсліў ён. — Мы вам будзем дапамагаць, калі ёсць патрэба, разумеючы, што ствараем сабе канкурэнцыю. Калі не будзе перашкод, нам расійскага рынку хопіць назаўсёды».

Ён прывёў у прыклад адмову Кітая ад амерыканскай соі, што стварыла для расіян магчымасць экспартаваць сою ў Кітай. «Давайце тады мы зоймемся якім-небудзь іншым прадуктам для сябе і для Расіі, — слушна заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба падысці разумна і збалансаваць усе патокі».

Яшчэ адзін кірунак для партнёрства — рыбаводства. «Карэлія з'яўляецца бясспрэчным лідарам у Расійскай Федэрацыі па вытворчасці азёрнай фарэлі, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Лічу, што ўзаемадзеянне ў рыбаводчай галіне таксама карысна абодвум бакам».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мэта беларускай дзяржавы — максімальная практычная эфектыўнасць супрацоўніцтва з расійскім рэгіёнам.

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Артур Парфенчыкаў пералічыў для журналістаў і іншыя сферы партнёрства паміж Беларуссю і Карэліяй: робататэхніка, судабудаўніцтва, лесакарыстанне, дрэваапрацоўка, органы мясцовага самакіравання. Ён нагадаў, што сур'ёзная частка абсталявання на Беларускай атамнай электрастанцыі вырабляецца ў Петразаводску.

Пры гэтым значная частка размовы кіраўніка расійскага рэгіёна і Прэзідэнта Беларусі датычылася і гуманітарнай сферы. «Мы шмат гаворым пра ўзаемадзеянне ў галіне культуры, — расказаў Артур Парфенчыкаў. — У Карэліі актыўна дзейнічае беларуская культурная аўтаномія. Для нас вельмі важна, каб з'явіўся прамы авіярэйс Мінск — Петразаводск, гэтага жадаюць нашы жыхары. Такая сувязь будзе садзейнічаць развіццю бізнесу і турызму. Мы запрашаем жыхароў Беларусі ў нашу рэспубліку. Мы сустрэнем вас як самых блізкіх людзей, як братоў. Вельмі чакаем!»

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

25 САЮЗНЫХ ПЫТАННЯЎ

Пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы ўчора прайшло ў Брэсце. Па яго выніках прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі падпісалі шэраг дакументаў, а таксама бакі адобрылі праект бюджэту на наступны год. Даходы ў ім запланаваны ў памеры больш за 7 мільярдаў расійскіх рублёў (каля 106 мільёнаў долараў), расходы — каля 6,3 мільярда рублёў (95 мільёнаў долараў). Значная частка пойдзе на фундаментальныя даследаванні.



Фота БелТА.

Пагадненне аб узаемным прызнанні віз з Расіяй будзе падпісана пасля завяршэння ўнутрыдзяржаўных працэдур у Беларусі. Пра гэта журналістам пасля пасяджэння паведаміў **прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС.**

«Сёння мы не падпісвалі візавае пагадненне. Беларускі бок да пасяджэння Саўміна не паспеў завяршыць унутрыдзяржаўныя працэдуры. Думаю, у найбліжэйшы час мы іх завершым і пагадненне будзе гатовае да падпісання, — сказаў ён.

На парадку дня пасяджэння знаходзілася 25 пытанняў. Сяргей Румас пракаментаваў асноўныя кірункі ўзаемадзеяння, якія ўчора абмяркоўваліся паміж бакамі. «Галоўным індыкатарам двухбаковых адносін быў і застаецца ўзаемны тавараабарот. На жаль, у 2018 годзе дысбаланс у гандлі таварамі паміж Беларуссю і Расіяй узмацняецца. Па выніках дзесяці месяцаў 2018 года адмоўнае сальда ўзаемнага гандлю павялічылася на 2,3 мільярда долараў. Прычына гэтага — мы павольна набліжаемся да вырашэння важных для беларускага боку праблемных эканамічных пытанняў. Гэта і абмежаванні Рассельгаснагляду доступу на расійскі рынак прадукцыі беларускага аграпрамысловага комплексу, забарона на ўдзел беларускіх прадпрыемстваў у сістэмах дзяржаўных закупак для патрэб абароны і бяспекі, абмежаванне на ўдзел у расійскіх праграмах субсідавання закупак сельскагаспадарчай тэхнікі», — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада.

Пры гэтым ён адзначыў, што найважнейшы складнік двухбаковага ўзаемадзеяння — гэта безбар'ернае асяроддзе для суб'ектаў гаспадарання. На думку Сяргея Румаса, у рамках Саюзнай дзяржавы знойдзены аптымальны механізм вырашэння пытання — рабочыя групы па ключавых кірунках супрацоўніцтва. Па выніках іх работы атрымалася скараціць пералік праблемных пытанняў доступу на рынкі Беларусі і Расіі.

Таксама на пасяджэнні быў разгледжаны план мерапрыемстваў па далейшым развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Саюзнай дзяржаве на 2019 год. Сяргей Румас нагадаў, што ў кастрычніку была зацверджана нацыянальная стратэгія па гэтым кірунку. Беларусь і Расія тут ставяць сугучныя задачы. Таму, на думку беларускага прэм'ер-міністра, надзвычай важнай з'яўляецца каардынацыя сумесных намаганняў па развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы.

Прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў лічыць, што гандлёва-эканамічныя адносіны развіваюцца пазітыўна, калі глядзець па паказчыках тавараабароту: ён расце — за дзесяць месяцаў гэтага года амаль на 13 %, блізка падышоў да ўзроўню ў 30 мільярдаў долараў. Але кіраўнік расійскага ўрада пагадзіўся, што яшчэ ёсць над чым працаваць. «Трэба працягваць сістэмна, паслядоўна здымаць тыя бар'еры, якія існуюць і якія стрымліваюць узаемны гандаль, ствараць для нашых кампаній спрыяльныя і раўнапраўныя ўмовы доступу на рынкі, падтрымліваць малы і сярэдні бізнес, асабліва ў тых сектарах, якія мы лічым перспектыўнымі, — гэта высокатэхналагічныя, навукаёмістыя сектары. І тое, і другое ў нас нядрэнна развіта», — падкрэсліў Дзмітрый Мядзведзеў.

Акрамя таго, кіраўнік расійскага кабміну лічыць, што неабходна развіваць узаемадзеянне паміж расійскімі і беларускімі рэгіёнамі. А таксама — нарошчваць аб'ёмы паставак тавараў сумеснай вытворчасці на рынкі трэціх краін.

Пры гэтым Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў, што ёсць неабходнасць паглядзець на тое, што адбывалася з саюзным дагаворам з 1999 года: што выканана, а што не. «Ёсць цэлы шэраг адчувальных тэм, якія мы рэгулярна абмяркоўваем. Яны датычацца выраўноўвання ўмоў гаспадарання ў нашых краінах, аказання эканамічнай, у тым ліку фінансавай, падтрымкі».

Абодва прэм'ер-міністры адзначылі сімвалічнасць правядзення пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы ў горадзе-героі Брэсце напярэдадні 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 75-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Надзея АНІСОВІЧ, *г. Брэст.*

Прэс-тур

ДЗЕ НАРАДЖАЮЦЦА «ВОЛАТ» І «МЯЦЕЛІЦА»

Расійскія журналісты наведалі Міншчыну

Цэлы дзень «на колах» і работа ва ўмовах цэйтноту — рытм прэс-тура досыць складаны. Але сапраўдных рэпарцёраў, звыклых з дэдлайнамі і ненармаваным працоўным днём, такім парадкам сутак не напалохаць. У другі дзень візіту ў Беларусь расійскія журналісты паспелі трапіць на Мінскі завод колавых цягачоў, «Амкадор» і «Штадлер Мінск».

На Мінскім заводзе колавых цягачоў гасцям паказалі распрацоўкі, а таксама пазнаёмілі з асноўнымі кірункамі дзейнасці і сацыяльнай палітыкай прадпрыемства, на якім працуе амаль пяць тысяч чалавек. МЗКЦ — важны пункт у праграме прэс-тура, таму што рынак Расійскай Федэрацыі з'яўляецца стратэгічным для завода. Некаторыя машыны прадпрыемства вядомыя ў свеце пад маркай «Волат».

Далей журналісты адправіліся ў Дзяржынскі раён, дзе пакаштавалі беларускую... чорную ікру. І гэта не жарт! Прадпрыемства «ДГ-Цэнтр» з 2016 года ў горадзе Фаніпалі вырошчвае рыбу асятровых парод і пастаўляе сваю прадукцыю ў Расію, Казахстан, Арменію і іншыя краіны.

Пасля гэтага паказальным выступленнем тэхнікі здзіўлялі публіку працаўнікі «Амкадора». Пагрузчыкі сінхронна выпісвалі віражы і забівалі мяч у сетку. «Амкадор-Бранск» ужо добра вядомы на расійскім рынку. Плануецца стварыць яшчэ адну вытворчасць у Рэспубліцы Карэлія.

Заключным пунктам на карце Мінскай вобласці для журналістаў стаў «Штадлер». Цяпер расіяне ведаюць, дзе зроблены іх аэраэкспрэсы і піцерскія трамваі «Мяцеліца». Генеральны дырэктар завода Філіп Брунер правёў экскурсію і адказаў на пытанні. Цікавіліся госці магчымасцю адкрыцця філіяла ў Расіі, заробкамі, умовамі вядзення бізнесу. Адказваючы на пытанне, чаму для новага завода абралі Беларусь, кіраўнік назваў прыцягальныя ўмовы свабоднай эканамічнай зоны, выгадную геаграфію і кваліфікаваныя кадры.

Марыя ДАДАЛКА.

Кампетэнтныя адказы на актуальныя пытанні

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 15 снежня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На пытанні жыхароў краіны з 9 да 12 гадзін адкажуць:

старшыня БРЭСЦКАГА аблсавета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблсавета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Уладзімір Віктаравіч ДАМАНЕЎСКІ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Занятасць

АД ПРАФАРЫЕНТАЦЫІ ДА СУПРАВАДЖЭННЯ БІЗНЕСУ

Вясковай моладзі дапамогуць з працаўладкаваннем

У Беларусі запускаецца праект «EU4Youth: развіццё патэнцыялу для працаўладкавання». Ён дапаможа сацыяльна ўразлівай моладзі атрымаць запатрабаваныя прафесійна-тэхнічныя навыкі, знайсці годную работу і распачаць прадпрымальніцкую дзейнасць.

Праект разлічаны на тры гады. Яго рэалізуе Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа пры падтрымцы дацкага Чырвонага Крыжа і фінансаванні Еўрапейскага саюза, а таксама ў супрацоўніцтве з дзяржаўнымі органамі і грамадскімі арганізацыямі. Падобная праграма запушчана таксама ў Арменіі і Грузіі.

— Пятая частка насельніцтва нашай краіны — гэта моладзь. У агульнай колькасці занятых маладыя людзі складаюць чвэрць. У асноўным яны працуюць у крэатыўных галінах эканомікі, — прыводзіць статыстыку **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.** — Важна, каб моладзь магла прымяніць свае навыкі пры ўладкаванні на работу. У Мінску шмат магчымасцяў для самарэалізацыі, таму трэба падтрымаць жыхароў сельскіх населеных пунктаў, малых гарадоў.

Мэтавыя рэгіёны — Магілёўская і Гомельская вобласці. Да сацыяльна ўразлівай моладзі адносяць жыхароў аддаленых вёсак, маладых бацькоў, былых асуджаных, тых, хто вырас у шматдзетных ці няпоўных сем'ях. Якім менавіта катэгорыям будзе аказана падтрымка, рэгіёны вырашаць самастойна.

Каардынатар праекта Наталля ЖАК-ГАЛГОЎСКАЯ расказвае, што спачатку прааналізуюць рынак працы і патрэбу ў кадрах прыватнага сектара, апытаюць моладзь, каб даведацца, з якімі праблемамі яны сутыкаюцца падчас пошуку работы.

Далей чакаюцца семінары па прафарыентацыі, дзе хлопцаў і дзяўчат навучаць у тым ліку складаць рэзюмэ, знаходзіць вакансіі, праходзіць гутаркі, звяртаць увагу на пэўныя юрыдычныя моманты пры заключэнні кантрактаў. Пройдуць кірмашы вакансій, акадэміі лідарства і прафесійныя курсы.

Для сельскай мясцовасці мэтазгоднае рашэнне пытанняў працаўладкавання — гэта самастойная занятасць. Таму ў рамках праекта будзе падрыхтаваны дапаможнік па прадпрымальніцтве. За маладымі людзьмі, якая захочуць адкрыць сваю справу, замацуюць куратараў. Створаць таксама архіў бізнес-ідэй, якімі можна будзе скарыстацца і пасля завяршэння праекта.

Грамадскія арганізацыі (акрамя Чырвонага Крыжа, падключацца Ліга добраахвотнай працы моладзі, Цэнтр падтрымкі і развіцця юнацкага прадпрымальніцтва, «Гендарныя перспектывы») будуць актыўна супрацоўнічаць з цэнтрамі занятасці і мясцовымі выканаўчымі органамі.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Грошы

У СЕЦІВЕ ЎСЁ ЧАСЦЕЙ КУПЛЯЕМ СА СМАРТФОНАЎ

А разлічвацца за тавары надзейней банкаўскай карткай

За першыя 10 месяцаў года каля 44 % пакупак аплачвалася з мабільных прылад, у той час як год таму — 36 %. Цалкам верагодна, што да 2020-га смартфон стане асноўным плацежным інструментам для большасці кліентаў інтэрнэт-крамаў, паведамляе група кампаній Assist.

Часцей за ўсё ў інтэрнэт-крамах здзяйсняліся пакупкі ў такіх сегментах, як «Тавары для дзяцей», «Дастаўка гатовых страў» і «Анлайн-гіпермаркеты». Ключавыя фактары тут — мінімум часу, які людзі гатовыя выдаткаваць на куплю, і зручнасць карыстання мабільнай праграмы, што дазваляе проста аформіць заказ.

Пры гэтым тавары для жывёл апынуліся сярод тых галін, у якіх пакупнікі значна больш ахвотна карыстаюцца персанальным камп'ютарам, чым мабільнай прыладай. Прадукты харчавання, тавары для дома і дачы, мэбля, beauty-прадукцыя, вандроўкі і квіткі на мерапрыемствы таксама часцей набываюцца з камп'ютара.

Крыху менш пакупнікі карыстаюцца смартфонам, чым «персаналкай», выбіраючы вопратку, абутак, кветкі і падарункі, аплачваючы сувязь, інтэрнэт і тэлебачанне.

«Па звестках Гандлёвага рэестра нашай краіны, на 1 ліпеня 2018 года колькасць інтэрнэт-крамаў перавысіла 17 тысяч, а іх прырост з пачатку года склаў 10 %. Большасць — каля 51 % — належаць індывідуальным прадпрымальнікам. Агульны тавараразварот інтэрнэт-крамаў за мінулы год склаў 3,4 % у агульным аб'ёме рознічнага тавараабароту. Рост продажаў з дапамогай e-Commerce ў бягучым годзе адзначаюць шматлікія беларускія анлайн-гандляры. Некаторыя з іх назіраюць рост у 30 %. Таксама варта адзначыць, што банкаўскай карткай пры аплаце карыстаюцца 12 % пакупнікоў і гэта на трэць больш, чым летась. Пры гэтым безнаяўны від аплаты надзейней абараняе правы спажыўца, таму што выразна прасочваецца шлях грошай ад спажыўца да суб'екта», — адзначыў **дырэктар правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслаў СЕНІН.**

Сяргей КУРКАЧ.

Надвор'е

ПОДЫХ ХОЛАДУ СА СКАНДЫНАВІІ

У панядзелак уначы маразы будуць дасягаць мінус 15 градусаў

У гэтыя выхадныя тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам халоднага скандынаўскага антыцыклону. Усталюецца зімовы характар надвор'я, а ў пачатку наступнага тыдня маразы ўзмоцняцца, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У пятніцу малаактыўны франтальны раздзел прынясе месцамі невялікі снег. На асобных участках дарог будзе галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад нуля да 5 марозу. А вось заўтра надвор'е ў краіне будзе вызначаць перыферыя скандынаўскага антыцыклону. У некаторых раёнах пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да мінус 7 градусаў, ва ўсходніх раёнах краіны яна панізіцца да 9 марозу. Днём сіноптыкі прагназуюць ад нуля да мінус 6 градусаў.

Будзе таксама халодна і ў нядзелю, толькі ўдзень на заходніх раёнах краіны адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзела, які ссоўваецца з боку Карпат. Таму ўначы істотных ападкаў не чакаецца, раніцай і ўдзень пераважна па захадзе пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 марозу, па ўсходзе пры праясненнях яна панізіцца да мінус 12 градусаў. Максімальная тэмпература ўдзень складзе ад мінус 1 да мінус 7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак будзе пераважна без ападкаў, толькі па захадзе краіны чакаецца кароткачасовы снег, слабая мяцеліца. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 4—10 марозу, уначы па ўсходзе краіны пры праясненнях яна панізіцца да мінус 11—15 градусаў. А вось днём у заходніх раёнах краіны тэмпература паветра складзе ад нуля да мінус 3 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

АЎТО «ЎЛЯЦЕЛА» Ў ДОМ І ЗАГАРЭЛАСЯ

Такое здарэнне адбылося ў Зэльвенскім раёне.

У вёсцы Тулава легкавая машына вылецела з дарогі, урэзалася ў вугал прыватнага дома і загарэлася.

Па інфармацыі ДАІ Гродзенскай вобласці, усё адбылося прыкладна ў 13.25. Кіроўца «Фольксвагена» ехаў у напрамку вёскі Дзергілі. Як мяркуецца, на закругленні дарогі ўлева ён няправільна выбраў хуткасць руху, у выніку чаго з'ехаў з дарогі, пашкодзіў агароджу ўчастка і ўдарыўся ў вугал жылога дома. Пасля гэтага адбылося ўзгаранне аўтамабіля, які потым тушылі некалькі спецаўтамабіляў МНС. У выніку аварыі ў рэанімацыю патрапіла жанчына, якая ехала на пярэднім пасажырскім сядзенні «Фольксвагена». Кіроўца не пацярпеў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Тэрэзе Мэй удалося захаваць пасаду прэм'ера Вялікабрытаніі

Лідар кіруючай кансерватыўнай партыі і прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй заручылася падтрымкай дэпутатаў-кансерватараў у час праведзенага ў сераду галасавання па вотуму даверу ёй і захоўвае свае пасады.

Па словах Грэма Брэйдзі, лідара парламенцкага аб'яднання, якое іграе асноўную ролю ў вызначэнні новага кіраўніка партыі, калі ў гэтым узнікае неабходнасць, у падтрымку Мэй прагаласавалі 200 дэпутатаў ад кансерватыўнай партыі, супраць выказаліся 117. Каб застацца на чале кіруючай партыі, Мэй патрабавалася простая большасць — падтрымка паловы тых, хто прагаласаваў плюс адзін голас.

На думку назіральнікаў, перавага ў 83 галасы — вялікая перамога Мэй. Цяпер, лічаць палітолагі, яна зможа прыглушыць галасы сваіх праціўнікаў, якія дамагаюцца «жорсткага «брэксіта», а яе шанцы правесці праз парламент здзелку з ЕС аб умовах выхаду краіны з супольнасці ўзрастаюць.

Суд у ЗША прысудзіў былога юрыста Трампа Майкла Коэна да трох гадоў турмы

Былы асабісты юрыст Дональда Трампа Майкл Коэн асуджаны да трох гадоў турмы за парушэнне выбарчага заканадаўства і хлусню кангрэсу. Як выявіў суд, Коэн расплаціўся грашыма, прызначанымі для кампаніі Трампа, за маўчанне дзвюх жанчын, якія меліся расказаць пра свае блізкія адносіны з Трампам.

Адвакат абвінавачанага Гай Петрыла сказаў у судзе, што яго падабароннаму «не пашанцавала працаваць з Трампам».

Коэн стаў першым чалавекам з каманды Трампа, які атрымаў такі доўгі тэрмін у сувязі з расследаваннем умяшання Расіі ў амерыканскія выбары 2016 года. Расследаванне вядзе спецпракурор Роберт Мюлер. Суддзя Уільям Поўлі, вядомы сваім жорсткім стаўленнем да абвінавачваных з асяроддзя «белых каўнерыкаў», прысудзіў Коэна да трох гадоў, а таксама прызначыў яму штраф.

«Як юрыст спадар Коэн мог бы і лепей ведаць законы», — адзначыў суддзя. Сам Коэн перад абвяшчэннем прысуду адзначыў, што бярэ на сябе адказнасць за ўсе правапарушэнні, якія супраць яго былі выстаўлены. «Маім абавязкам было пакрываць яго брудныя справы», — ахарактарызаваў ён сваю работу з Трампам.

Названы найгоршы год у гісторыі чалавецтва

Вучоныя Гарвардскага ўніверсітэта прыйшлі да высновы, што 536 год нашай эры з'яўляецца самым горшым у гісторыі чалавецтва. У гэты час адбыліся катастрафічныя вывяржэнні вулканаў, якія выклікалі працяглае пахаладанне і голад. Пра гэта паведамляе выданне Science Alert.

Даследчыкі прааналізавалі ледзяны керн — узоры лёду, назапашанага за стагоддзі — у Грэнландыі і Антарктыцы. Спецыялісты выявілі сляды тэфры (адкладанняў попелу і іншых вулканічных выкідаў), якія датуюцца 536 годам (10-ы год праўлення візантыйскага імператара Юстыніяна I). Гэты перыяд адпавядае самаму рэзкаму зніжэнню сярэднегадавой тэмпературы ў Паўночным паўшар'і за некалькі тысяч гадоў. Па словах сучаснікаў, сонца не грэла, а па яркасці яно зраўнялася з Месяцам.

Вучоныя таксама выявілі сляды другога буйнога вывяржэння, якое адбылося ў 540 годзе. Абедзве падзеі, хутчэй за ўсё, сталі прычынай наступнай пандэміі чумы, названай Юстыніянавай чумой, засухі, неўраджаю, анамальных з'яў надвор'я і голаду.

Аднак у пластах лёду, датаваных ужо 640 годам нашай эры, былі заўважаны сляды свінцу. Прычынай забруджвання металам паслужыла здабыча серабра з свінцовых руд і пачатак чаканкі манеты, што спрыяла новаму эканамічнаму росту.

СПАДАРОЖНІК ВЫХОДЗІЦЬ НА АРБІТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Уладзімір Уладзіміравіч, наколькі разумею, у Фаніпалі няма праблемы з работай. Пашыраюцца дзеючыя вытворчасці, адкрываюцца новыя. А значыць, ствараюцца рабочыя месцы. Ці не так?

— Як і ўсюды, хтосьці едзе на работу ў Мінск, нехта, наадварот, выбірае Фаніпаль. У нас працуюць людзі з іншых раёнаў, асабліва з блізкіх — Уздзенскага, Стаўбцоўскага. Усё залежыць ад таго, наколькі чалавека задавальняе заработная плата. А рабочых месцаў у горадзе сапраўды хапае: з'яўляюцца новыя прадпрыемствы. Так што кадры заўсёды патрэбныя. Аднак у кожнага ёсць права выбару.

— Паколькі ў вас шмат прамысловых прадпрыемстваў, то і інвестыцыі ўкладваюцца ў развіццё гарадской інфраструктуры?

— Інвестыцыі, вядома, прыцягваюцца, інвестары пачынаюць праяўляць цікавасць да праектаў. Але хочацца большай аддачы, і на гэта ёсць прычыны. Гаспадар, як кажуць, лічыць кожны рубель, які ўкладвае ў справу, і чакае, каб ён прынёс прыбытак. У нас, напрыклад, на вуліцы Брэсцкай пабудаваны жылы дом. Але там планавалася цэлая шматпавярховая забудова. Кошт інвестыцыйнага праекта — 16,5 мільёна долараў. Аднак акрамя жылля інвестар павінен пабудаваць басейн. Пакуль ніхто не адгукнуўся. Калі б не трэба было плаціць за зямлю, а за гэтыя сродкі ўладкаваць басейн і дзіцячую паліклініку, магчыма, інвестар знайшоўся б хутчэй.

Сёлета будаваць шматпавярховыя дамы пачынаюць таксама ЗАТ «ДГ-Цэнтр», таварыствы з абмежаванай адказнасцю «Квадрат Груп» і «Эледзі Компані». Апошняя кампанія ўзводзіць дамы, дзе першыя паверхі адводзіць пад сацыяльныя, бытавыя, гандлёвыя аб'екты, офісы. Такі падыход спрашчае праблему развіцця інфраструктуры: няма неабходнасці будаваць асобныя будынкі, скажам пад аптэкі, магазіны, цырульні, крамы. Гэта на сённяшні дзень зручна для людзей — на першы час побач ёсць усё неабходнае.

— Горад актыўна будуецца за кошт ушчыльнення або прыцягнення новых тэрыторый?

— Свабодных участкаў у горадзе няма. Таму вымушаны выходзіць за яго межы. Два зямельныя ўчасткі агракамбіната «Дзяржынскі» будуць выведзены з сельгасабароту для будаўніцтва жылля, сацыяльных аб'ектаў і інфраструктуры.

На сённяшні дзень у Фаніпалі ў чарзе для паляпшэння жыллёвых умоў стаіць 1380 чалавек, у тым ліку 96 шматдзетных сем'яў. Вялікі попыт на ўчасткі пад індывідуальнае будаўніцтва. На ўліку — 528 чалавек, сярод іх 17 шматдзетныя. Сёлета распачалі будаўніцтва дома на 60 кватэр для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. На гэтай пляцоўцы ўжо пракладваюцца інжынерныя сеткі, узведзены фундамент. Што датычыцца індывідуальных участкаў, то тут справа складанейшая. Апошні раз іх пад будаўніцтва выдзялялі ў 2010 годзе. Мы выкарыстоўваем участкі тых людзей, якія своечасова на працягу трох гадоў не ўзвялі каробку і, ацаніўшы свае фінансавыя магчымасці, добраахвотна адмовіліся ад зямлі. Ужо аформлены тры ўчасткі, якія будуць выстаўлены на аўкцыён.

— Што асабіста вас, як мэра, не задавальняе ў развіцці горада?

— На жаль, не так, як хацелася б, развіваецца інфраструктура. У нас не хапае ўстаноў адукацыі. Дзіцячы сад і школа запраектаваны на вуліцы Зялёнай. Новы сучасны садок здалі сёлета да першага верасня, але нават з улікам яго, дзіцячыя дашкольныя ўстановы перапоўнены. Сярэдняя школа і гімназія працуюць у дзве змены. На стадыі праектавання жылой забудовы не прадугледжваецца інфраструктура. Спачатку — дом, затым сады, школы, крамы. Такі падыход трэба змяняць. Напрыклад, калі сёння будуем шэсць жылых дамоў, дзе будзе жыць шмат маладых сем'яў, то ўжо цяпер зразумела, што праз два гады паўстане пытанне з дзіцячым садам.

Горад мае патрэбу ў грамадскім транспарце. Дзясцей, што жывуць у мікрараёнах Паўднёвы-1 і Паўднёвы-2, падвозяць да месца вучобы школьнымі аўтобусамі, якія ходзяць усяго некалькі разоў на дзень. Але ж, акрамя таго, і жыхары пасёлка павінны мець магчымасць выехаць у горад. Думаю, у найбліжэйшай перспектыве гэтае пытанне вырашым.

Разам з тым ёсць больш значныя праблемы. На станцыі Фаніпаль закрыты пешаходны мост цераз чыгуначныя пуці. Аб'ект знаходзіўся ў аварыйным стане, што пагражала бяспецы людзей. Цяпер арганізацыі і прадпрыемствы дастаўляюць сваіх работнікаў да месца працы сваім аўтатранспартам, што патрабуе дадатковых расходаў. А пасажыры і жыхары перахо-дзяць пуці цераз чыгуначны пераезд, што, зрэшты, таксама небяспечна. Беларуская чыгунка плануе будаўніцтва новай станцыі, а таксама падземнага перахода ў 2019—2020 гадах.

— Чаго яшчэ не хапае гораду?

— Парку для правядзення розных масавых мерапрыемстваў. Для яго ўладкавання ёсць цудоўнае месца — яблыневы сад каля храма Узнясення Гасподняга. Тут неабходна пасадзіць маладыя дрэўцы, зрабіць дарожкі, устанавіць лаўкі. У Фаніпалі жыве шмат маладых сем'яў з дзецьмі. І бацькі скардзяцца, што тут не хапае зон для адпачынку, няма стадыёна, басейна.

Мы імкнёмся да таго, каб нашым людзям жылося камфортна. Але на тыя грошы, што атрымліваем ад продажу зямельных участкаў, шмат не зробіш. У асноўным гэтыя сродкі ідуць на добраўпарадкаванне. Хутка ўезд у горад упрыгожаць дзве каваныя стэлы-паказальнікі. Гэтыя арт-аб'екты зробіць мясцовы ўмелец. На іх будзе значыцца год заснавання горада, герб. Дарэчы, герб Фаніпаля ўяўляе сабой шчыт, у сярэбраным полі якога размешчана перавернутае зялёнае вастрыё з выявай залатога яблыка. Упэўнены, што гэты твор стане сімвалам горада. Заказалі таксама 49 паказальнікаў, якія змесцім з двух бакоў вуліц, каб прыгожа глядзелася ды і людзі змаглі без праблем знайсці неабходны адрас.

Вельмі актуальная тэма — добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, рамонт пад'ездаў, капітальны рамонт і ўцяпленне жылых дамоў. Зразумела, у новых дамах прадугледжана ўсё неабходнае: дзіцячая гульнявая пляцоўка, паркоўка. Двары старых дамоў не разлічаны на вялікую колькасць аўтатранспарту. У наступным годзе запланавалі зрабіць аўтастаянку на вуліцы Якуба Коласа, 11. Гэта дапаможа разгрузіць горад. Яшчэ адно пытанне, якое хвалюе жыхароў некалькіх вуліц, — адсутнасць збудаванняў па адводзе ліўневых вод. Ужо падрыхтаваны праект, які прадугледжвае ўладкаванне скрыжавання з двухбаковым рухам, сістэмай відэаназірання і ліўнёўкай. Яшчэ адзін праект кальцавой развязкі будзе рэалізаваны на вуліцы Заводскай.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Медыцынская дапамога... у электронным фармаце

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Укараненне інфармацыйных тэхналогій у медыцыну — сур'ёзнае якаснае пераўтварэнне, да якога трэба рыхтавацца не толькі тэхнічна. Давядзецца змяніць светапогляд пацыента, навучыць яго працаваць у асабістым кабінеце. Досвед Эстоніі паказаў, што для таго каб грамадзяне сталі актыўнымі карыстальнікамі кабінета пацыента, ім спатрэбілася дзесяць гадоў.

Між іншым, электронны кабінет дазволіць кожнаму чалавеку атрымліваць доступ да сваёй асабістай медыцынскай інфармацыі, выключыць лішнія паходы ў паліклініку для падаўжэння дзеяння рэцэпта, афармлення даведак і г. д. А ўрачы змогуць атрымліваць поўную і дакладную інфармацыю пра пацыента, што дазволіць зменшыць рызыку ўрачэбных памылак і аказваць комплексную персаніфікаваную медыцынскую дапамогу. Створаная сістэма дазволіць забяспечыць доступ да важнай інфармацыі на любым узроўні аказання дапамогі (у паліклініцы, бальніцы, у экстранных сітуацыях, калі ад хуткасці прыняцця рашэння часта залежыць жыццё пацыента) і ў рэжыме рэальнага часу. У якасці пункта ўваходу ў асабісты кабінет пацыента будзе выкарыстоўвацца пляцоўка Адзінага дзяржаўнага партала электронных паслуг, а для ідэнтыфікацыі пацыентаў паліклінікі будзе прымяняцца ID-пашпарт.

Зараз вядзецца работа над праектам новага закона «Аб ахове здароўя», дзе плануецца прапісаць усе нюансы, што датычацца ўкаранення электроннай сістэмы аховы здароўя, правы і абавязкі пацыентаў і медыцынскіх работнікаў.

«Першымі паўнавартаснымі ўладальнікамі электронных медыцынскіх карт стануць нованароджаныя».

— Мы прадугледжваем, што апрацоўка ўсіх персанальных даных пацыента ў інфармацыйных сістэмах будзе адбывацца толькі з яго пісьмовай згоды, — запэўніў Віктар Сідарэнка. — І калі ён па рэлігійных перакананнях ці па нейкіх іншых прычынах адмовіцца ад апрацоўкі ўласных даных, то для яго нічога не зменіцца, — медыцынская інфармацыя па-ранейшаму будзе занатоўвацца на папяровым носьбіце.

Мінск, Мінская і Гродзенская вобласці абраныя пілотнымі рэгіёнамі, у якіх у 2019 годзе пачнецца рэалізацыя праекта па ўкараненні электроннай сістэмы аховы здароўя.

Пілотны праект мае на ўвазе, што шэраг устаноў аховы здароўя вобласці будуць інфарматызаваныя, пачынаючы з пракладкі новых інжынерных сетак, падключэння да шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт, стварэння абароненых каналаў сувязі, заканчваючы набыццём камп'ютарнай тэхнікі і падрыхтоўкай персаналу да працы з такімі сістэмамі.

Асобныя элементы асабістага кабінета пацыента ўжо тэсціруюцца ў 39-й сталічнай паліклініцы.

— У найбліжэйшы час мы спадзяёмся прэзентаваць яго магчымасці, — паведаміла яе **галоўны ўрач Вольга ЕСМАНЧЫК.** — У прыватнасці, у рэжыме рэальнага часу чалавек можа інтэгравацца з базай паліклінікі і атрымаць інфармацыю з электроннай амбулаторнай карты. Ён зможа сфарміраваць выпіску з яе, убачыць вынікі аналізаў, якія ёсць у базе, а таксама рэцэпты, якія яму выпісваў урач. Мінск першы ў краіне ўступіў у актыўную фазу інфарматызацыі аховы здароўя. Ужо ўсе ўстановы ў горадзе маюць электронныя амбулаторныя карты. Мы, напрыклад, больш як дзесяць гадоў вядзём амбулаторныя карты ў электронным фармаце, але пры гэтым захоўваецца і папяровы носьбіт, куды заносяцца звесткі пра агляды ўрачоў, вынікі абследаванняў і г. д.

«Давядзецца змяніць светапогляд пацыента, навучыць яго працаваць у асабістым кабінеце».

Паступовы пераход персанальных даных пацыентаў у электронны фармат распачаўся не толькі ў сталіцы. Але паколькі размова ідзе пра вялікі масіў даных, асабліва калі гэта датычыцца пацыентаў ва ўзросце, то такі пераход запатрабуе шмат часу. Таму першымі паўнавартаснымі ўладальнікамі электронных медыцынскіх карт стануць нованароджаныя.

Плануецца, што асноўная частка работ па праекце завершыцца да 2022 года. Будуць арганізаваныя абароненыя каналы сувязі і перадачы даных і дыстанцыйныя цэнтры іх апрацоўкі.

— Але гэта не значыць, што затым працэс спыніцца. ІТ-тэхналогіі ўвесь час развіваюцца, — адзначыў Віктар Сідарэнка. — Для нас зараз вельмі важна пратэсціраваць магчымасці электроннай сістэмы аховы здароўя: адна справа, калі размова ідзе пра 10 тысяч электронных картак, і зусім іншая — калі ў электронны фармат будуць пераведзены 9,5 мільёна медыцынскіх дакументаў. І штодня ў сістэму будуць уваходзіць па ўсёй краіне 50 тысяч урачоў.

Электронная сістэма аховы здароўя таксама прадугледжвае далейшае развіццё тэлемедыцыны, што асабліва важна для аказання дапамогі пры дыягностыцы складаных выпадкаў. Як вынік, на выхадзе мы атрымаем аптымізацыю фінансавых сродкаў за кошт скарачэння залішніх дыягнастычных даследаванняў, больш рацыянальнае выкарыстанне лекавых сродкаў, павелічэнне часу на прыём пацыента... Важным таксама стане ўкараненне электроннай сістэмы падтрымкі прыняцця клінічных рашэнняў, накіраваная на дапамогу ўрачу пры выбары правільнай тактыкі дыягностыкі і лячэння. Напрыклад, нельга будзе прызначыць чалавеку лекі, да якіх у яго ёсць супрацьпаказанні, ці ўзаемавыключальныя лекавыя сродкі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЗГУБІШ — НЕ ШКАДУЙ, ЗНОЙДЗЕШ — НЕ РАДУЙСЯ

Беларусь — вялікая. Не ведаю, як у вас, а ў нашай мясцовасці кубел — гэта такая драўляная бочка з вельмі добра (мыш не праскочыць!) падагнанай накрыўкай. Пад імі некалі (а недзе, можа, і цяпер?) трымалі розныя прадукты.

А вось кубельнікі (з націскам на е) — гэта ўжо зусім іншае. У нас так вясельнікаў называюць — мужчын з не самай блізкай радні жаніха, якім даручалася, можна сказаць, святое — перавозка пасагу (у нас і зноў жа ён жаночага роду — пасага).

Але ж хопіць пра словы, бо гісторыя не пра іх, а пра само вяселле.

Яно, традыцыйнае, пачыналася, як правіла, пасля вянчання і ў хаце нявесты. Да бацькоў жаніха вясельны абоз адпраўляўся толькі назаўтра і ехаў, вядома ж, гучна, прыгожа. Для маладых стараліся знайсці брычку альбо файны вазок (часам прыхаваныя ад калектывізацыі — дзе-небудзь пад сенам), на калгасных коней надзявалі найлепшую вупраж і шаргуны (нешта накшталт ашыйнікаў з начышчанымі да бляску меднымі званочкамі)...

Але ж гэта — трошкі пазней, бо самымі першымі і за нейкую гадзіну да выезду асноўнага картэжу ў дарогу (часам — кіламетраў за дзесяць-пятнаццаць, бо ў невялікіх паазерскіх вёсачках выбар дзяўчат быў такі ж невялікі) выпраўляліся менавіта кубельнікі. На адны сані ці калёсы ім грузілі шафу, на другія — клункі (па-нашаму — вандзэлкі) з завязанымі падушкамі, коўдрамі ды іншым нявесціным скарбам, — каб да прыезду маладых яны ўсё гэта не проста завезлі ў жаніхову хату, але яшчэ і разлажылі-расставілі...

Дык вось, значыць, выязджаюць яны. Першым — Валодзя. На санях у яго шафа і сам ён мужчына досыць мажны. Так што месца ў яго — зусім крыху, ледзь не пад хвастом у каня, бо садзіцца на шафу — гэта бронь божа: раптам паломіш (іх пасля вайны з нейкай тонкай фанеркі рабілі).

Карацей — кіламетры са два гэты кубельнік так-сяк яшчэ ехаў, — потым спыніўся. «Давай, — сказаў Колю, — майго каня прывяжам да тваіх саней, а самі ўдваіх сядзем на вандзэлкі ды і паедзем сабе».

Як надумалі, так зрабілі. А заадно і выпілі, бо ў іх, як той казаў, з сабою было...

Добранька хлопцам стала: цёпла, утульна — яшчэ і таму, што ў падушках сядзелі...

Але ж пільнасці спярша не трацілі, час ад часу азіраліся: ну, як там шафа, маўляў?

Ляжала яна як належыць: роўненька, хораша і амаль усю дарогу, здаецца...

У канцы яе, перад вёскай, кубельнікі вырашылі яшчэ раз спыніцца, бо, вядома ж, помнілі, што пасаг ім трэба не проста прывезці, а менавіта даставіць — з гонарам, з «помпай». Для гэтага Валодзя вырашыў адвязаць свайго каня і (хай людзі бачаць!) за аброць правесці па вуліцы. Ён злез з воза і ледзь не самлеў: прывязаны ззаду конік радасна матляў галавой, відаць, ад таго, што прабег нейкі час... улегцы: шафы на месцы не было — «выпаўзла», падлюка, з-пад вяровак...

Дзякаваць богу, ні на вяселлі, ні на жыцці маладых гэта не адбілася. Згубу падабраў картэж, які ехаў следам. І даставіў, як належыць, трохі раней, чым прыехалі маладыя.

Але ж потым, калі хацелі некага прынізіць, то ва ўсёй акрузе і доўга яшчэ казалі: «З цябе касец (напрыклад), як з Валодзі кубельнік!»

Іван Сіманёнак,

г. Паставы.

«ПАШЧАСЦІЛА» ДЗЯДЗЬКУ...

Не так даўно сядзела я ў Слуцку на вакзале, аўтобус свой чакала, слухала, калі пасадка на іншыя.

— От цяпер добра жыць, — сказала раптам жанчына, прыладкаваўшыся побач. — Едзь сабе куды толькі хочаш! Не тое што некалі: альбо пехатой трапі, альбо на спадарожных, калі хто падбярэ яшчэ...

Далей — быў расказ пра адну з вось такіх паездак.

— Неяк раз спыніўся ля нас грузавік, — успамінала кабета, — шафёр згадзіўся падвезці. Мы з той радасці як бачыш залезлі ў кузаў. Бачым, бліжэй да кабіны скрынкі з памідорамі стаяць і ўся падлога саломай усланая. Расселіся мы на ёй ды і паехалі, да горада мігам даляцелі. А ўжо там, на ўездзе, шафёр спыняе машыну, кажа:

— Усё, людзі, далей не павязу, бо могуць штрафу ўляпіць.

Не дык не. Дзякуй і за тое. Сталі мы памалу злазіць, вандзэлкі свае забіраць. Дзядзька Мікола толькі закешкаўся, нешта ўсё хадзіў ад борта да борта, заднія кішэні ў портках мацаў ці што?

— Э, до цягнуць ката за хваста! — скамандаваў яму шафёр. — Мне ехаць трэба. Злазь!

— А як жа я злезу, браце? — войкаў дзядзька ў кузаве. — А што ж мне рабіць? Мусіць, гемарой...

— Герой, не герой, — не слухаў яго кіроўца, — гэта мне абсалютна без розніцы. Злазь давай, і ўсё тут!

Шафёр нават борт адкрыў, каб дзядзьку лацвей прызямліцца.

Як Мікола гэта рабіў, мы, шкада, не ўбачылі, бо паспяшаліся на базар. Між сабой хіба пагаманілі, з якога перапуду гэты дзядзька ды раптам герой?

Толькі потым дазналіся, што ён у сваіх тонкіх картовых портках сеў на памідор, які са скрынкі выкаціўся ў салому. І вось так праехаў усю дарогу да Слуцка.

...Як ён пачуваўся ў горадзе, я даведацца не паспела: на вакзале аб'явілі чарговае адпраўленне аўтобуса, і жанчына рванула на пасадку. А я ўслед ёй падумала: добра, што вось гэтак сесці «пашчасціла» дзядзьку. А калі б нейкай цётцы?

Соф'я Атрохава,

в. Селішча, Слуцкі раён.

ЧАРОЎНАЯ СІЛА МАСТАЦТВА

Даўным-даўно прайшлі гады так званага татальнага дэфіцыту...

Ён, вядома ж, быў, амаль на ўсё, але пры гэтым — хочаш пайсці на канцэрт, то калі ласка! Купляй білет ды слухай — хоць Кабзона, хоць Лешчанку, хоць Караклаіч, глядзі, як танцуе Махмуд Эсанбаеў...

Пры сённяшніх цэнах гэта задавальненне ўжо вельмі дарагое: сем разоў падумаеш, перш чым паўпенсіі аддаць, а тады канцэрты былі даступныя. Ва ўсякім разе, я бегала амаль на ўсе, аб чым анікольк не шкадую, бо ёсць што ўспомніць... І нават пахваліцца, што «жыўцом» (пра фанаграмы нават гутаркі не было!) слухала маладую Алу Пугачову, «Песняроў» з пачынаючым Леанідам Барткевічам, бачыла Юрыя Нікуліна... Галоўным жа кумірам быў для мяне Віктар Вуячыч.

І вось нарэшце доўгачаканы цуд! Афішы ў горадзе: ён прыязджае — да нас! З канцэртамі! Я тут жа ў касу, а білетаў ужо няма, расхапалі спрытнейшыя... Што рабіць? Спадзявацца хіба на лішні?

Задоўга да пачатку выступлення «дзяжуру» ля ўвахода ў канцэртную залу, да многіх кідаюся з пытаннем, ці няма ў іх лішняга білеціка?..

Усё марна: і першы званок ужо празвінеў, і другі, і трэці... Там, у зале, вось-вось заспявае Вуячыч, а я ўсё стаю пад дзвярыма, з мальбой гляджу на кантралёрку і раптам чую за спінай:

— Каму білет?

Аукцион состоится 16.01.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», 220108, г. Минск, ул. Казинца И. П., д. 121А, комн. 327, тел. 8 (017) 212-14-51.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, помещение 9, тел. 8 (017) 324-70-57.

Задаток перечисляется нар/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», проводимом **16.01.2019** г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений **14.01.2019** в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Контактное лицо для осмотра Объектов – Сак Ольга Валерьяновна, тел.: 8 (029) 751-10-00, 8 (017) 398-65-47

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Изменения в проектной декларации ООО «ДАТЧ СТАР», опубликованной в газете «Звязда» 24.03.2018 г.

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6-11 секции, II очередь строительства, секции 1-3)» (I очередь строительства, 9-й пусковой комплекс).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются:

50 (пятьдесят) машино-мест площадью от 11,5 до 17 кв. м, составляющей долларовый эквивалент от 8000 до 16 500 долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты».

Дополнительную информацию можно получить по адресу:
г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 19, помещение 860.
Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000.

УНП 191061436

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Молодечненского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **магазина общей площадью 632,3 кв. м, инв. № 630/С-69297, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004279 площадью 0,3953 га (право аренды до 2111 года), по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 144**.

Часть Объекта (66,7 кв. м) сдается в аренду *(сведения об арендаторе можно получить у организатора аукциона или продавца)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **869 081,05** бел. руб. (задаток 5 % от начальной цены – **43 454,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 15,5 %.**

Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.11.2018. Аукцион состоится **26.12.2018** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.12.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На гэтым тыдні можаце стаць папулярнай асобай, апынуўшыся ў цэнтры падзей. Пра вас будуць расказваць, на вас будуць звяртаць увагу, праўда, тут і да плётак недалёка. Адкрываюцца новыя перспектывы і магчымасці, як у працы, так і ў творчасці. У панядзелак могуць адбыцца падзеі, якія палепшаць настрой. У пятніцу кантакты з кіраўніцтвам прынясуць карысць і вырашаць некаторыя жыццёва важныя пытанні. У суботу паспрабуйце праявіць цярпенне і стрыманасць, пазбегнуць сямейных сварак.

ЦЯЛЕЦ. Неабходна цвёрда стаць на ногі і пачаць маштабнае наступленне практычна па ўсіх франтах. Падтрымка начальства дазволіць пазбавіцца ад варожасці і інтрыг калег. У чацвер парадуюць навіны ў асабістым жыцці. У суботу зоркі прадказваюць татальную занятасць: вы самі не пакінеце сабе ні хвіліны вольнага часу.

БЛІЗНЯТЫ. На гэтым тыдні вас чакае рамантычнае спатканне. Падобна на тое, што ў вас у самым разгары галаваружны раман. У чацвер, калі эмацыянальны напал спадзе, можа паступіць інфармацыя, якая адкрые перад вамі новыя перспектывы і гарызонты. Субота — самы насычаны падзеямі дзень тыдня. Сябры парадуюць увагай, выдатна будуць складвацца любоўныя адносіны.

РАК. Вас чакае поспех і папулярнасць. На гэтым тыдні верагодная камандзіроўка або далёкая паездка. У чацвер, апынуўшыся ў цяжкім становішчы, паспрабуйце даверыцца інтуіцыі, так вы з большай верагоднасцю пазбегнеце памылак. А вось на логіку разлічваць не варта. Не трэба хвалявацца з-за чыёйсьці пустой балбатні. Нішто не павінна адцягваць ад вызначанага плана, і вы дасягняце мэты.

ЛЕЎ. Здаецца, у глыбіні душы вы разумееце, што самі сябе ўводзіце ў зман. Прыгледзьцеся больш уважліва да дзелавых партнёраў і калег: ці не занадта вы ім давяраеце? Нягледзячы на цяжкасці, атрымаецца рухацца наперад, намацваць і абыходзіць схаваныя перашкоды. У пятніцу не варта мітусіцца і займацца складанымі справамі. Будзьце больш цярплівымі да памылак і недахопаў навакольных, шукайце кампрамісы, хоць часам гэта будзе нялёгка.

ДЗЕВА. На гэтым тыдні неабходна будзе ўтрымаць высокі прафесійны ўзровень, нават калі вашы думкі накіраваныя зусім у іншае рэчышча. Упэўненасць у сваіх магчымасцях і паслядоўнасць у дзеяннях дапамогуць заваяваць сімпатыю навакольных і ўмацаваць добрыя адносіны з начальствам. Паспрабуйце не грузіць сяброў сваімі праблемамі. У другой палове тыдня будзеце ў добрай форме і зможаце паспяхова завяршыць пачатыя раней справы.

ШАЛІ. Можаце аказацца аб'ектам павышанай увагі, не дазваляйце нясмеласці і залішняй сціпласці перашкодзіць атрымаць з гэтага ўсю магчымую выгаду. Але не старайцеся ўказваць іншым, што ім рабіць. Магчыма, у сераду пад ціскам абставін вы зменіце свой пункт гледжання. Сям'я можа зашмат чакаць ад вас, але не прымайце ўсё блізка да сэрца.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні можа рэзка ўзрасці ваша актыўнасць, што не праміне станоўча адбіцца на ўсіх справах. Для таго каб больш паспяхова спраўляцца са складанымі задачамі, паспрабуйце загадзя іх распланаваць на ўвесь тыдзень наперад. У панядзелак пажадана пазбягаць мітусні. У сераду добра было б упарадкаваць свой лад жыцця, не ўцягвацца ў кругазварот чужых праблем. Выхадныя будуць удалымі для паездак і падарожжаў.

СТРАЛЕЦ. На гэтым тыдні вам можа быць складана пераключацца з вырашэння сваіх праблем на праблемы навакольных людзей. Не варта блытаць работу і сяброўства: можна лёгка застацца і без бізнесу, і без сяброў. У аўторак пастарайцеся не кантактаваць з людзьмі, якія не выклікаюць у вас сімпатыі. У выхадныя правядзіце больш часу з сям'ёй.

КАЗЯРОГ. Пачатак тыдня можа быць вельмі напружаны, назапасьце цярплівасць і не рабіце ніякіх рашучых крокаў. Серада — спрыяльны час для завязвання новых знаёмстваў. Вялікі шанц знайсці сродкі для рэалізацыі сваіх ідэй. У пятніцу будзеце адчуваць падтрымку навакольных. Верагодныя пазітыўныя перамены на рабоце. У выхадныя паспрабуйце аднавіць затрачаныя сілы.

ВАДАЛІЙ. На гэтым тыдні з'явіцца шанц вырашыць некаторыя супярэчнасці, якія хвалявалі. Але для гэтага спатрэбіцца разумны кампраміс з вашага боку. У сераду варта паказаць вашы таленты і здольнасці ва ўсім харастве. Іх не змогуць не заўважыць. Чацвер можа засмуціць дробнымі непрыемнасцямі, але гэта плата за адсутнасць буйных праблем. У выхадныя паспрабуйце навесці парадак і раскласці ўсё па палічках — як у любімым доме, так і ў сваіх думках і пачуццях.

РЫБЫ. Непажадана мітусіцца і спяшацца, плывучы супраць плыні, вы толькі дарма выдаткуеце сілы. На рабоце вядзіце справы пісьменна, прадумвайце кожную дробязь, і тады ўсё атрымаецца. У аўторак лепш не паказвацца на вочы начальству, каб пазбегнуць канфліктнай сітуацыі. Чацвер — выдатны дзень для праявы сяброўскіх і любоўных пачуццяў. Многія падзеі другой паловы тыдня могуць круціцца вакол сямейнага ачага, гаспадарчых і бытавых клопатаў.

Даты. Падзеі. Людзі

14 СНЕЖНЯ

У краіне

1818 год — беларускі археолаг, фальклярыст і этнограф Зарыян Даленга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі) упершыню атрымаў ад Віленскага ўніверсітэта адкрыты ліст на права правядзення археалагічных раскопак на тэрыторыі Беларусі.

1920 год — у Мінску на базе політэхнічнага вучылішча створаны палітэхнікум (з 1922 года — Беларускі інстытут сельскай гаспадаркі, з 1933-га — Беларускі політэхнічны інстытут, з 2002-га — Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт).

1922 год — на 4-м Усебеларускім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў прынята рашэнне аб уваходжанні Беларускай ССР на аднолькавых правах з РСФСР, УССР і ЗСФСР у Саюз ССР.

1924 год — у Мінску на беларускай мове выйшаў першы нумар штомесячнага часопіса для дзяцей і падлеткаў «Бярозка» (да верасня 1929 года — «Піянер Беларусі», да красавіка 1941-га — «Іскры Ільіча», з чэрвеня 1945 года — «Бярозка»).

1963 год — рабочаму пасёлку Полацкі нададзены статус горада абласнога падпарадкавання, які быў названы Наваполацкам.

1971 год — нарадзіўся (горад Мінск) Дзмітрый Даўгалёнак, беларускі спартсмен (веславанне на байдарках і каноэ), майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту СССР. Чэмпіён XXV Алімпійскіх гульняў (1992 год), чэмпіён свету, неаднаразовы чэмпіён СССР.



1985 год — у Беларусі нарадзіўся 10-мільённы жыхар.

У свеце

1911 год — нарвежскі падарожнік Руаль Амундсен дасягнуў Паўднёвага полюса, на месяц апярэдзіўшы экспедыцыю Роберта Скота.

1947 год — у СССР праведзена грашовая рэформа, дэнамінацыя грашовых знакаў і адменена картачная сістэма забеспячэння насельніцтва.

1958 год — савецкія даследчыкі дасягнулі Полюса адноснай недаступнасці ў Антарктыдзе і заснавалі савецкую навуковую станцыю «Полюс недаступнасці».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.21	16.47	7.26
Віцебск —	9.18	16.29	7.11
Магілёў —	9.11	16.37	7.26
Гомель —	8.59	16.42	7.43
Гродна —	9.35	17.04	7.29
Брэст —	9.27	17.13	7.46

Месяц

Маладзік 7 снежня. Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Навума.*
К. *Альфрэда, Ізыдара, Яна.*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Псіхіятр кажа, што я зацыклены на помсце.
Гэта мы яшчэ паглядзім.

Залатое вяселле. Карэспандэнт мясцовай газеты бярэ інтэрв'ю ў юбіляра:

— Як вам удалося з жонкай пражыць столькі гадоў і ні разу не пасварыцца?

— А мы адразу ж пасля вяселля дамовіліся: наспявае канфлікт, я сыходжу ў прыбіральню.

— Ну?

— Што «ну»?! Вось так і жыву 50 гадоў у прыбіральні!

Калі на стале з'явіўся святочны торт — гэта значыць, што ў гэтым доме вам будуць рады яшчэ хвілін пятнаццаць.

У краме пакупнік пытае прадаўца:

— Скажыце, калі ласка, а гэта геннамадыфікаваная морква?

Прадавец:

— Не, а чаму вы пытаецеся?

Морква:

— Сапраўды, а чаму вы пытаецеся?..

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ПРАЦЫ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4528.

Нумар падпісаны ў 19.30 13 снежня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

14 снежня 2018 г. № 50 (483)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

УВАГА!

ПРАПАНУЕМ ПАДПІСАЦЦА

на пятнічны нумар газеты «Звязда» з дадаткам «Мясцовае самакіраванне» (выходзіць штотыднёва).

Для фізічных асоб – 633072

Для юрыдычных асоб – 63307

Афармiць падпiску можна на тэрмiн ад аднаго месяца да паўгода.

ТЭМА ТЫДНЯ

КОЛЬКІ КАШТУЕ БЯСПЕКА?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Зіма — строгі экзаменатар пажарнай бяспекі. З-за кароткіх дзён і халадоў усе імкнуцца больш часу праводзіць у памяшканні. Якому, аднак, патрэбна ацяпленне. У гарадской кватэры гэтая праблема вырашаецца проста з дапамогай батарэй, цёплы пар у якія паступае з кацельнай. У прыватным сектары аднастайнасці няма. Больш заможныя людзі абагравaюцца з дапамогай катлоў. Але і дагэтуль застаецца шмат вясковых домікаў, дзе адзіная крыніца ацяплення — старая добрая печка. Шмат з іх верай і праўдай служаць не адно дзесяцігоддзе, а рамонт іх каштуе даволі значных грошай.

І каб не застацца пасярод зімы з няспраўнай печкай, ад якой можна ўчадзець, паклапаціцца пра гэта трэба загадзя. Некаторым сацыяльным групам — шматдзетным сем'ям і людзям паважнага веку, якія жывуць адны, — з гэтым дапамагаюць прадстаўнікі дзяржаўных органаў. Як? Аб гэтым чытайце ў сённяшняй тэме тыдня.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4-й, 13-й стар.

ПАРТНЁР ТЭМЫ ТЫДНЯ:

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Вопыт сусветных практык

па развіцці мясцовага самакіравання разглядалі ў Мінску. стар. 3

«Жучок» як сваяк пажару

Агляды бяспекі выяўляюць сацыяльныя праблемы ды хібы свядомасці. стар. 13

Хто не стане ўтрыманцам?

І адпаведна, не будзе аплачваць «камуналку» напоўніцу. стар. 14

Тэхналогіі любяць ініцыятыўных

Як Браслаў стаў безвугляроднай сталіцай Беларусі. стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9

Побратимство и контакты

Парламенты Беларуси и Франции в ближайшей перспективе намерены укрепить сотрудничество, в том числе на уровне рабочих групп, сообщает сайт верхней палаты белорусского парламента.

Конкретные шаги по расширению двусторонних межпарламентских связей прорабатываются с учетом договоренностей, достигнутых во время визита председателя Совета Республики Михаила Мясниковича в Париж, который состоялся 11 ноября.

В рамках недавнего визита спикер верхней палаты парламента встречался с президентом Сената Франции Жераром Ларше. Стороны договорились углублять межпарламентское партнерство, а также содействовать дальнейшему развитию экономических связей и инвестиционного сотрудничества между странами.

Эти и другие вопросы двусторонней повестки дня были рассмотрены на встречах Чрезвычайного и Полномочного Посла Республики Беларусь во Франции Павла Латушко с дипломатическим советником президента Сената Франции Юбером де Каносом в ноябре и президентом комиссии по финансам Сената Франции Винсаном Эбле в декабре.

В настоящее время изучается возможность организации официального визита в Беларусь в следующем году рабочей группы Сената Франции во главе с его вице-президентом Шарлем Гене, возглавляющем парламентскую группу дружбы с Беларусью.

К слову, в 2018 году впервые в истории белорусско-французских отношений были созданы рабочая группа по сотрудничеству с Францией в Совете Республики и аналогичная группа дружбы «Франция—Беларусь» во французском Сенате. Белорусская сторона планирует, что в числе основных направлений деятельности этих групп будет содействие расширению сотрудничества городов-побратимов двух стран, установлению прямых контактов между деловыми кругами, развитию двусторонних отношений в инвестиционной, сельскохозяйственной, экологической и других сферах деятельности.

«Роль парламентов в современном мире»

Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по законодательству и государственному строительству, член Межпарламентской комиссии Совета Республики и Совета Федерации по межрегиональному сотрудничеству Алла Бодак выступила на международной конференции «Роль парламентов в современном мире. Совет Федерации Федерального Собрания Российской Федерации — 25 лет по пути многовекторного развития».

sovrep.gov.by

Мероприятие прошло в Москве и было приурочено к 25-летию Совета Федерации Федерального Собрания России.

В работе международной конференции приняли участие иностранные парламентарии — руководители групп по сотрудничеству и сопредседатели комиссий по сотрудничеству Совета Федерации с верхними палатами парламентов государств, а также представители международных парламентских организаций.

За дело!

11 декабря подвели итоги республиканского конкурса «Человек своего дела — 2018» в пищевой промышленности.

Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по экономике, бюджету и финансам Владимир Пантюхов поздравил лауреатов конкурса и принял участие в церемонии вручения дипломов лучшим отечественным предприятиям, работающим на белорусском рынке.

Диплом лауреата конкурса в номинации «За внедрение инновационных технологий в пищевой промышленности и компетентность в управлении предприятием» получил член профильной Постоянной комиссии, генеральный директор открытого акционерного общества «Гродненский мясокомбинат» Анатолий Гришук.

Конкурс, учрежденный и проводимый редакцией государственного бизнес-журнала «Дело», собрал на своей площадке парламентариев, представителей министерств и ведомств, бизнесменов, зарубежных гостей, журналистов и др.

РАЗВИВАЯ ПЕРСПЕКТИВЫ СОТРУДНИЧЕСТВА

Председатель Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Михаил Мясникович на прошлой неделе провел встречу с Постоянным координатором ООН/ПРООН в Республике Беларусь Иоанной Казаной-Вишневецки.

Фото БелТА.

Как сообщает официальный ресурс верхней палаты парламента, во встрече приняли участие заместитель председателя Совета Республики, национальный координатор по ЦУР Марианна Щеткина, председатели постоянных комиссий Совета Республики Сергей Рахманов и Виктор Сиренко, глава представительства Международной организации по миграции в Республике Беларусь Зейнал Хаджиев, представитель ЮНИСЕФ в Беларуси Рашед Мустафа Сарвар, представитель ВОЗ в нашей стране Батыр Бердыклычев.

Беларусь активно работает со структурами ООН по различным направлениям, расширяется портфель совместных проектов, отметил Михаил Мясникович.

— Рассчитываем, что наши связи в последующий период приобретут устойчивый, стабильный характер в рамках тех проектов, которые для нас взаимовыгодны и интересны, — подчеркнул он.

Председатель Совета Республики поблагодарил делегацию ООН за проекты международной технической помощи. «Это прямая и косвенная поддержка тех преобразований, которые проводит Беларусь. Радует, что многие проекты находятся в рамках подготовки, и мы видим, что у нас хорошие перспективы», — заявил он. При этом важно, чтобы в рамках сотрудничества учитывались и национальные интересы, и интересы ООН.

Во время встречи обсуждалось взаимодействие Беларуси и ООН по достижению Целей устойчивого развития.

Кроме того, Михаил Мясникович предложил развивать сотрудничество и по вопросам местного управления и самоуправления. «Можно было бы подумать о дополнительных совместных проектах в этой части», — добавил он.

Также на встрече обсуждались возможности участия структур ООН в проектах, приуроченных к тысячелетию Бреста.

Иоанна Казана-Вишневецки отметила высокий уровень сотрудничества ООН с Беларусью, подчеркнула особую роль парламента в двустороннем взаимодействии. Она добавила, что 24 января в Минске пройдет Первый белорусский форум по ЦУР, где предметом обсуждения станет проделанная Беларусью работа, а также дальнейшие перспективы по достижению Целей устойчивого развития.

Для роста доходов и развития регионов

Постоянная комиссия по экономике, бюджету и финансам Совета Республики рассмотрела основные параметры республиканского бюджета на 2019 год и концептуальные подходы, предлагаемые в проекте новой редакции Налогового кодекса. О результатах заседания сообщается на сайте верхней палаты белорусского парламента.

В бюджетном процессе сохранены традиционные подходы, которые позволяют генерировать дополнительные поступления в бюджет при благоприятной ценовой конъюнктуре на сырье.

Важнейшими составляющими бюджетной системы являются местные бюджеты. По мнению членов Постоянной комиссии, уровень поддержки регионов из республиканского бюджета целесообразно сохранить, что повлечет рост доходов местных бюджетов и, соответственно, развитие регионов.

Предложено предусмотреть механизмы стимулирования опережающего развития регионов-доноров и поддержки регионов-реципиентов. Формирование местных бюджетов должно обеспечивать сближение их финансовых возможностей и создавать предпосылки для развития.

Работа над проектом новой редакции Налогового кодекса ведется в рамках выполнения требований главы государства об обеспечении простоты, понятности правовых норм, о недопущении правовой неопределенности и несогласованности предписаний кодекса.

В проекте новой редакции Налогового кодекса нашли свое отражение инициативы Совета Республики, направленные на развитие предпринимательства и предусматривающие снижение налоговой нагрузки на субъекты хозяйствования. Например, расширение возможности применения инвестиционного вычета по налогу на прибыль; снижение ставки налога на прибыль и подоходного налога с физических лиц в отношении дивидендов в случае реинвестирования в развитие производства; освобождение вновь построенных объектов и земельных участков, на которых они расположены, от имущественных налогов в первый год их эксплуатации.

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

У Бялыніцкім раёне парламентарыі абмеркавалі папраўкі ў закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні»

Дэпутаты Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце правялі на базе раёна выязное пасяджэнне. У рамках яго яны наведалі ў Бялыніцкім райвыканкаме службу «аднаго акна», цэх па вытворчасці сыроў, азнаёміліся з вопытам работы па добраўпарадкаванні ў аграгарадку Вялікая Машчаніца, пабывалі ў калгасе «Радзіма» на тэрыторыі Вішоўскага сельсавета. На пленарным пасяджэнні ў Бялыніцкім райвыканкаме парламентарыі разам з мясцовымі дэпутатамі абмеркавалі, якія папраўкі і змяненні трэба ўнесці ў закон, каб ён больш эфектыўна функцыянаваў. Выказваліся меркаванні наконт мэтазгоднасці замацавання тэрыторый за суб'ектамі гаспадарання і юрыдычнымі асобамі, пераходу раённай службы «адно акно» на аказанне электронных паслуг. З боку мясцовых дэпутатаў паступіла прапанова канкрэтызаваць у новай рэдакцыі, што маецца на ўвазе пад словам «добраўпарадкаванне» і якія могуць быць выкарыстаны крыніцы яго фінансавання.

— Такія сустрэчы карысныя тым, што дапамагаюць парламентарыям убачыць, як на справе рэалізуюцца законы, а нам выказаць свой пункт гледжання, — рэзюмаваў **старшыня Бялыніцкага райсавета дэпутатаў Андрэй ГАНЧУК.**

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ОПЫТ ПЕРЕДОВЫХ ПРАКТИК

Семинар по развитию ассоциаций местных Советов депутатов в Беларуси прошел в Минске

В О вторник, 11 декабря, в Совете Республики совместно с экспертами Совета Европы прошел семинар по развитию ассоциаций местных Советов депутатов. В нем приняли участие члены Совета по взаимодействию органов местного самоуправления, члены Совета Республики и депутаты Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь, представители органов местного самоуправления: председатели Советов депутатов областного, базового, первичного уровней, руководители органов территориального общественного самоуправления, представители органов госуправления и гражданского общества, ученые.

В своем приветственном слове **спикер верхней палаты парламента Михаил МЯСНИКОВИЧ** отметил, что Совет Республики согласно договоренности с представителями Конгресса местных и региональных властей Совета Европы пригласил для участия в семинаре лучших экспертов по вопросам местного самоуправления, в том числе – развития ассоциаций местных Советов.

– Высокое представительство во главе с директором Департамента по демократическому управлению Генерального директората Совета Европы Дэниэлом Попеску присутствует на семинаре для того, чтобы поделиться своими передовыми практиками, – отметил Михаил Мясникович и поблагодарил гостей за внимание к вопросам местного самоуправления в Беларуси.

Он обратил внимание на значение, которое наша страна придает расширению сотрудничества с Советом Европы и Европейским союзом:

– Сопредседательство Беларуси в Конференции региональных и местных властей «Восточного партнерства» (КОРЛИП) в 2017 году, а также проведение с организациями Совета Европы в Минске заседания Бюро КОРЛИП, совместный с Конгрессом местных и региональных властей в сентябре 2018 года круглый стол и нынешний семинар – это примеры позитивных изменений белорусско-европейских отношений. Хорошо, что встречи и дискуссии приобретают регулярный характер, – отметил председатель Совета Республики.

К слову, Беларусь является членом 15 международных договоров Совета Европы. Статус приглашенных наблюдателей в Конгрессе местных и региональных властей имеют Совет по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики и Фонд имени Льва Сапеги. В сфере местного самоуправления сотрудничество Беларуси с Советом Европы развивается по двум направлениям: с Конгрессом местных и региональных властей и Департаментом по демократическому управлению Генерального директората по демократии.

По мнению спикера верхней палаты белорусского парламента, этого недостаточно для системного и действительно высокоэффективного сотрудничества.

– Хорошо, что Беларусь участвует в реализации региональной программы Совета Европы для стран «Восточного партнерства». Но при всей важности региональных и страновых мероприятий в форматах семинаров, тренингов, круглых столов мы можем работать над более масштабными программами и проектами. Мы в Беларуси к этому готовы, – заявил Михаил Мясникович.

Он напомнил, что о конкретных направлениях и подходах шла речь в сентябре 2018 года на круглом столе и во время встречи Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко с председателем конгресса Гудрун Мослер-Тернстрем.

– Надо закреплять и детализировать эти договоренности, работать над новыми проектами, – акцентировал внимание участников председатель Совета Республики.

Он отметил, что в Беларуси настроены заимствовать практический опыт стран – членов Совета Европы с учетом своих национальных интересов. В ноябре нынешнего года в Минске были сближены позиции с директором конгресса Жаном-Филиппом Бозулем.

– На мой взгляд, будет актуально, если мы сегодня конструктивно обсудим подходы по гармонизации белорусского законодательства с положениями Европейской хартии местного самоуправления, вопросы создания Национальной ассоциации местных органов самоуправления (в том числе разработку дорожной карты), включая те из них, которые целесообразно рассмотреть на планируемой в Минске в апреле 2019 года конференции по созданию Национальной ассоциации местных органов самоуправления, – предложил Михаил Мясникович.

Он подчеркнул, что работа ведется не с чистого листа. В частности, в законе «О местном управлении и самоуправлении» еще в 2010 году законодательно были закреплены базовые принципы Европейской хартии местного самоуправления.

– Пока Беларусь не присоединилась к хартии, но надо идти дальше. И белорусская сторона этим занимается: совершенствуется законодательство, активизировалась работа Совета по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики в регионах Беларуси, – отметил Михаил Мясникович. – Но если смотреть объективно, у нас еще много нерешенных задач. Мы их видим и над ними работаем. Например, считаем, что создание ассоциаций местных Советов депутатов в областях Беларуси – это перспективное направление деятельности по развитию местного самоуправления.

По мнению председателя Совета Республики, опыт работы Гродненской и Могилевской областных ассоциаций местных Советов депутатов – пусть небогатый, но свой собственный – этому свидетельство.

Учитывая значительный экспертный потенциал Совета Европы, Беларусь заинтересована в получении информации о лучших практиках стран – членов Совета Европы в этой сфере общественной деятельности.

– Сильное и самостоятельное самоуправление, основанное на национальном законодательстве – это база для формирования эффективного гражданского общества и один из основных элементов социально-экономической стабильности в государстве, – подчеркнул Михаил Мясникович. – Беларусь не входит в состав объединенной Европы, но мы живем в Европе и уважительно относимся к общеевропейским ценностям. Тема нашего семинара свидетельствует о том, что у нас очень много точек соприкосновения и общих интересов.

Фото Евгения ПЕСЕЦКОГО.

На пресс-подходе председатель Совета Республики подчеркнул актуальность вопросов по повышению эффективности работы местных Советов депутатов.

– Главное, чтобы были подготовлены соответствующие условия, которые позволят вовлечь в вопросы самоуправления огромный массив социально активных людей на местах, – отметил он. – Сочетание сильного государства и разумной, основанной на законодательстве самоорганизации, децентрализации позволяет более успешно решать все вопросы современного гражданского общества.

Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александр ПОПКОВ в свою очередь обратил внимание, что согласно национальному законодательству вопросы жизнеобеспечения в регионах возложены на местные власти:

– Местные Советы депутатов рассматривают план социально-экономического развития региона на определенный период, формируют бюджет, контролируют исполнение этих документов, и, естественно, им виднее, что надо делать на местах, чтобы были решены волнующие людей вопросы. Но у нас сложилась практика, когда все ждут принятия документов местного значения на уровне центральных властей, после которых вопросы сами по себе снимутся. Так не бывает, – заметил он. – Поэтому мы должны на основе опыта, накопленного у нас в стране, странах постсоветского блока, государствах, входящих в Европейский союз, приниматься за досконального изучение темы.

Для более эффективного решения этого вопроса Александр Попков не исключает возможности внесения некоторых изменений в действующие законы.

– Нужно уже сейчас думать, какие дополнительные полномочия можно предоставить местным органам власти. Одно из направлений – формирование ассоциаций местных Советов. Они должны позволить оперативнее решать злободневные вопросы, объединяя интересы граждан. И мы хотим изучить практику других стран в этом направлении. После этого мы выработаем так называемую дорожную карту, по которой и будем работать в дальнейшем.

Участникам семинара были озвучены нынешняя ситуация и тенденции местного самоуправления в Европе, опыт Англии, Дании, Болгарии, Сербии и других стран. Перспективы развития ассоциаций местных Советов депутатов в Беларуси в ближайшее время будут рассматриваться на заседании Совета по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики.

Директор Департамента по демократическому управлению Совета Европы Дэниэл ПОПЕСКУ заявил журналистам, что Совет Европы рассчитывает на укрепление сотрудничества с Беларусью в развитии местного самоуправления. Он выразил надежду на то, что страна в будущем сделает очень многое, чтобы полностью задействовать потенциал местного самоуправления. СЕ заинтересован в том, чтобы поддержать разработку дорожной карты по совершенствованию местного самоуправления в Беларуси. Дэниэл Попеску обратил внимание, что эксперты Совета Европы приезжают в Минск не для мониторинга и оценки. Их задача – продемонстрировать передовой опыт и, в свою очередь, ознакомиться с белорусскими наработками.

– Мы ни в коем случае не хотим навязывать какую-то точку зрения или же за вас определять путь развития. Наша цель – увидеть и понять, как устроено местное самоуправление в Беларуси, – подчеркнул он. – Мы готовы предложить разные варианты его развития, что, в свою очередь, усилит его органы и улучшит подотчетность. Как следствие – повысится качество жизни населения. Считаем, что Беларусь вполне сможет позаимствовать уроки соседних стран, которые подписали Европейскую хартию местного самоуправления и уже добились определенных успехов на этом поприще.

Более подробно о тематике прошедшего семинара читайте в следующем номере «МС».

Ольга АНУФРИЕВА, Валерьян ШКЛЕННИК.

ХТО ДАПАМОЖА Ў РАМОНЦЕ ПЕЧЫ?

«МС» высвятляла на прыкладзе Клімавіцкага раёна

Сяргей ХАРОШАНЬКІ — ратавальнік з дэпутацкім вопытам, вось ужо пяты год сумяшчае свае прафесійныя абавязкі з грамадскімі, другое скліканне з'яўляецца дэпутатам Клімавіцкага райсавета.

Ён заклапочаны тым, што колькасць пажараў у параўнанні з мінулым годам павялічылася. Асабліва балюча, што ёсць тыя, хто загінуў. Здаецца, усё прадугледзелі — і з рэйдамі хадзілі, і паасобку нагадвалі грамадзянам, каб не рызыкавалі, а ўсё роўна бяда здаралася.

— Прэтэнзій да стану пячнога абсталявання і праводкі ў тых дамах, дзе адбыліся пажары, не было. А вось да паводзін гаспадароў заўвагі ўзнікалі. Пяцёра з загінулых наогул нідзе не працавалі. Асноўная прычына іх гібелі — неасцярожнае абыходжанне з агнём.

Ёсць у нас на раёне сын і бацька, якія не даюць жыць спакойна, абодва п'юць, — прыводзіць прыклад Сяргей Харошанькі. — Наведваем іх нават у выхадныя дні, бо сям'я, мякка кажучы, ненадзейная. Сын, акрамя таго, што п'е, яшчэ і курыць. Што датычыцца печкі, то яна ў іх у нармальным стане. Дабіліся, каб сын, калі прыехаў з заробкаў, набыў аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Але ўсё роўна неспакойна. І на сельскі сход гэтую сям'ю вазілі, каб паглядзелі фільм і паслухалі, што бывае, калі правілы парушаюцца. Работнікі РАУС таксама з імі працуюць. Але пакуль безвынікова.

Паралельна з ратавальнікамі супрацьпажарную абстаноўку ў жылых дамах кантралююць супрацоўнікі аддзела адукацыі, сацыяльнай службы. Калі высвятляецца, што ёсць непаладкі з печчу або электраправодкай, з гаспадарамі працуюць па поўнай праграме. Для людзей маламаёмных, якім няма каму дапамагчы, адшукваюцца варыянты матэрыяльнай дапамогі. І майстра, каб замяніць праводку або адрамантаваць печ знайсці не праблема.

— Такая інфармацыя, перыядычна праходзіць праз раённую газету, — кажа Сяргей Харошанькі. — І мы не ставім мэту пакараць чалавека, наш абавязак нагадаць яму, што можа здарыцца няшчасце. Цяжэй за ўсё ўздзейнічаць на людзей працаздольных, якія ў стане самастойна паклапаціцца аб сваёй бяспецы. Але, калі чалавек зусім не жадае нас чуць, можам і штраф выпісаць.

Як дэпутат суразмоўнік перыядычна сустракаецца з насельніцтвам, цікавіцца праблемамі. Але з пытаннем, якім чынам замяніць праводку або адрамантаваць печ, кажа, ніхто не звяртаўся.

— Дарэчы, няспраўныя печ або электрычнае абсталяванне — гэта далёка не самая распаўсюджаная прычына пажараў, — удакладняе ён. — Больш за 80 % — гэта неасцярожнае абыходжанне з агнём. Адным словам — чалавечы фактар. Кожны грамадзянін, у рэшце рэшт, павінен адказваць за сваё жыццё і жыццё сваіх блізкіх у першую чаргу сам.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

На заметку

Галоўны інжынер ООО «Кампанія ЭВАС» Эдуард ДАЧАНКОЎ:

— Наша фірма існуе ўжо сёмы год, мы спецыялізуемся на будаўнічых работах. Але не адмаўляемся і ад работы з насельніцтвам. Па лініі сацыяльнай службы дапамагалі адзінокім грамадзянам з устаноўкай аўтаномных апавяшчальнікаў, замянялі праводку. Калі спатрэбіцца, можам і печ адрамантаваць. «МС» пацікавілася, колькі будаўнікі возьмуць за свае паслугі.

Суразмоўнік прывёў цэны без уліку матэрыялаў:

адрамантаваць печ можна ад 30 рублёў (рэанімаваць дымаход) да 100 рублёў (перакласці печ);

замяніць разетку або выключальнік будзе каштаваць каля 3 рублёў;

замяніць электраправодку (100 метраў) — 140 рублёў.

У ТЭМУ

Дырэктар Клімавіцкага раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Святлана ГРАШЧАНКА:

— Акрамя планавых аглядаў на прадмет супрацьпажарнай бяспекі, мы яшчэ працуем з інфармацыяй раённага аддзела па НС. Перш за ўсё вызначаем, да якой катэгорыі адносіцца чалавек. Калі гэта адзінокі пажылы грамадзянін або інвалід I або II групы, запрашаем, напрыклад, перазімаваць у нашым аддзяленні кругласутачнага знаходжання або бальніцы сястрынскага догляду. Прапануем сацыяльнага работніка, у абавязкі якога ўваходзіць і кантроль за супрацьпажарнай бяспекай кліента. Калі бачым, што ў чалавека матэрыяльныя цяжкасці, можам пасадзейнічаць атрыманню адраснай дапамогі або дапамогі з фонду сацыяльнай абароны. Сродкі для пэўных катэгорый грамадзян прадугледжаны таксама рознымі дзяржпраграмамі. На яе могуць разлічваць адзінокія пажылыя грамадзяне, інваліды I і II груп, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Грошы выдзяляюцца на бягучы рамонт печкі, праводкі, установку аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў і гэтак далей. Што датычыцца тых грамадзян, у якіх ёсць працаздольныя дзеці, пішам да іх лісты, каб яны паклапаціліся пра сваіх маламаёмных бацькоў. Звяртаемся і ў тыя арганізацыі, дзе калісьці працавалі грамадзяне, якія трапілі ў спіс на дапамогу.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Вось так бывае. Зусім нечакана сустрэнеш героя сваёй публікацыі, каб яшчэ раз упэўніцца, што жыццё будуецца па законах логікі... Але аб усім па парадку. 27 кастрычніка 2006 года ў нашай газеце быў змешчаны артыкул «Гераічныя канікулы Максіма Мрочкі». Гаворка ішла пра брэсцкага школьніка, які выратаваў на вадзе ўкраінскую дзяўчынку. На школьнай лінейцы тады Максіма ўрачыста ўшанавалі кіраўнікі абласных ведамстваў МНС дзвюх дзяржаў.

ПЛАНАВЫ РЭЙД

Пасля заканчэння профільнай ВНУ Максім зараз займаецца прафілактыкай надзвычайных сітуацый у Брэсцкім раённым аддзеле МНС. Разам з ім у рэйд па вёсках Шумакі і Церабунь накіраваліся **старшы ўчастковы інспектар Брэсцкага РАУС Аляксандр МЕЛЬНІК, супрацоўніца Клейнікаўскага сельвыканкама Святлана ДАВІДЗЮК і карэспандэнт «МС».**

> На добры толк, апавяшчальнік павінен быць у кожным доме і кожнай кватэры незалежна ад узросту жыльцоў.

Варта сказаць, што ў сямі вёсках Клейнікаўскага сельсавета налічваецца 27 адзінокіх грамадзян і крыху больш за 180 тых, хто пражывае адзінока. З наступленнем ацяпляльнага сезона ўсіх трэба наведаць, паглядзець, у якім стане печы, праводка, ці спраўныя аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, ці няма так званых «жучкоў» у электралічыльніках. Ну і, вядома, выпадае нагода пагаварыць з людзьмі, папытаць, што іх турбуе. Тым больш што з намі быў прадстаўнік праваахоўных органаў. Адзін з пенсіянераў, напрыклад, скардзіўся старшаму ўчастковаму інспектару на свайго земляка. Той пазычыў у гаспадара 50 рублёў, а калі прыйшоў час аддаваць, украў грошы ў іншага суседа ды аддаў папярэдняму. Неўзабаве афера высветлілася, і падчас разбору скрадзеныя грошы канфіскавалі, такім чынам з'явіўся новы пацярпелы. Аляксандр Мельнік растлумачыў нюансы заканадаўства. Урон вяртаецца першаму пацярпеламу. А апошні павінен патрабаваць кампенсацыю праз суд.

Адразу скажу, што большасць пажылых пенсіянераў на развітанне казалі нам: «Дзякуй, што зайшлі ў хату, праведалі». А такіх, хто не адкрыў дзверы, гэтым разам не было.

ВЫНІКІ ШМАТГАДОВАЙ РАБОТЫ

Варта адзначыць, што ў большасці пажылых вяскоўцаў жыллё падрыхтаванае да ацяпляльнага сезона як след: печы адрамантаваныя і пафарбаваныя, праводка падтрымліваецца ў належным стане, лічыльнікі не так даўно замянілі. А гэта значыць, работа, якая вядзецца гадамі, дае свае вынікі. У некаторых дамах службовым асобам заставалася толькі праверыць, як выконваліся ранейшыя прадпісанні, альбо сапраўды праведаць гаспадароў і ўпэўніцца, што ўсё ў парадку. Прыемна было пабываць у доме шматдзетнай сям'і Андрэя і Алены Аверчукоў. Маладыя гаспадары гадуюць чацвёра дзяцей, жыллё трымаюць ва ўзорным стане. Зазірнулі мы і да Вольгі Сяргееўны Круглей 1924 года нараджэння, якую дзяўчынай немцы вывезлі ў Германію. За бабульку можна не непакоіцца, бо яе даглядаюць дачка з зяцем. Да Мікалая Ягоравіча і Марыі Фёдараўны Фянцісавых, хоць абое яны інваліды, дзеці наведваюцца часцяком, аб чым сведчыць новы бездакорны рамонт. Адна гаспадыня сказала, што пачала літаральна на ваду дзьмуць у плане бяспекі, калі ў сястры ў Гродзенскай вобласці здарыўся пажар.

У гэтым рэйдзе давялося пачуць, і такое: «Толькі п'яніцы, якія кураць у ложку, гараць, а сталыя людзі сочаць за станам свайго жытла і зацікаўлены ў бяспечным карыстанні печчу ды электрычнасцю». З выказваннем не пагадзіўся Максім Мрочка: «Пільнасць і клопат пра бяспеку павінны быць заўсёды. Нават праводка, якая схаваная пад шпалерамі, можа стаць прычынай бяды, бо гаспадар не адразу заўважыць наступствы кароткага замыкання. Таму чарговы раз пагаварыць, папярэдзіць людзей не бывае лішнім.

«НАСЯКОМАЕ» З ДРОТУ І СВЯДОМАСЦЬ ЖЫЛЬЦОЎ

Першай, каго мы наведалі ў Шумаках, стала пенсіянерка Марыя Піліпаўна. 84-гадовая жанчына мае статус адзінокай паводле закона. Што гэта значыць? У Марыі Піліпаўны ёсць дачка, якая жыве ў Брэсце, але дачка сама дасягнула пенсійнага ўзросту. У такім выпадку маці прызнаецца адзінокай. Варта сказаць, што дачка-пенсіянерка клапоціцца пра маці, пра апошняе гаворыць парадак у доме, належны стан печы, электраправодкі. А вось пра паходжанне «жучка» ў сваім лічыльніку гаспадыня нічога растлумачыць не змагла. Ну, не сама ж яна яго туды прыладзіла! Гэты факт узяла на заметку спецыяліст сельвыканкама, а інспектар пажарнага нагляду абяцаў праз некаторы час зноў наведаць гэты дом.

12.00, 17.40 «Варажбітка» (12+).
13.10, 16.35 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.10 «Адкрыта» з Аксанай Байрак (16+).
15.05 «Простыя складанасці» (12+).
15.40 «Натуральны адбор» (12+).
20.40 «Абрабаванне па-жаночаму». Серыял (12+).
21.45 «Знак якасці» (16+).
22.40 «Савецкія мафіі» (16+).
0.00 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
0.45 «Адвакат д'ябла». Трылер (16+).

TV 1000 ТБ1000

6.10, 17.45 Аперацыя «Арго» (16+).
8.30 Эвалюцыя (12+).
10.35 Без заганы (16+).
12.50 Код да Вінчы (16+).
15.45 З 13 у 30 (12+).
20.10 Спяшайся кахаць (12+).
22.15 Скнара (16+).
0.10 Эд з тэлевізара (12+).
2.40 Філосафы: урок выжывання (16+).
4.25 Шпіён па суседстве (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 ЖАRA (16+).
8.10 Са мною вось што адбываецца (16+).
9.40 Паляўнічы-2. Мыцішчанскі маньяк (16+).
11.45 Дзень выбараў-2 (12+).
13.50 Дуброўскі (16+).
16.20, 4.30 Тры дарогі. 1—2-я серыі (12+).
18.25 Сняданак у таты (12+).
20.20 Вострaў шанцавання (16+).
22.00 Поп (16+).
0.30 Іван (6+).
2.20 Чатыры таксісты і сабака-2 (12+).

Discovery

6.00, 5.40 Навуковыя недарэчнасці (16+).
6.20 Супердубаванні старажытнасці (16+).
7.10 Гульні розуму (16+).
7.55, 3.10 Аўта-SOS (12+).
9.30, 2.20 Дзікі тунец (16+).
10.15 Неверагодны доктар Пол (16+).
11.00 Космас: прамы эфір (16+).
11.45, 18.45 Ледзяная дарога (16+).
12.35, 19.35 Вострaў бунтароў (16+).
13.20, 20.25 Інстынкт выжывання (16+).
14.05, 21.10, 0.45 Марс (16+).
14.55 Каралі рыбалкі (16+).
15.40, 18.00, 22.00, 1.35, 4.50 Расследаванні авіякатастроф (16+).
22.45 Секунды да катастрофы (16+).
23.10 Гарачыя граніцы: Лацінская Амерыка (16+).
23.55 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала (16+).
4.00 Машыны: разабраць і прадаць (16+).

National Geographic

8.00, 16.00, 22.00 Махінатары (12+).
9.00, 17.00, 23.00, 4.40 Круты цюнінг (12+).
10.00, 15.00, 21.00 Як гэта ўстроена? (12+).
11.00, 20.00, 5.30 Багажныя войны (12+).
12.00, 1.00, 6.20 Браты па зброі (12+).
13.00 Гарады, якія тонуць (12+).
14.00, 3.50 Небяспечная работа (16+).
18.00, 0.00 Залатая ліхаманка (16+).
19.00, 2.00, 7.10 Скрозь кратовую нару (12+).
2.55 Мадэль для зборкі (16+).

РЭПАРЦЁР

«ЖУЧОК» ЯК СВАЯК ПАЖАРУ

Агляды бяспекі нярэдка выяўляюць сацыяльныя праблемы ды хібы свядомасці

І людзі ставяцца з разуменнем да такой меры прафілактыкі. Гады тры таму мне давялося ў такім жа рэйдзе гаварыць з бабуляй, якая паклала свой апавяшчальнік у кош ды аднесла на дрывотню, бо «ён пры распалцы печы пішчаў» і пужаў гаспадыню. Праўда, і тут мы сустрэлі гаспадара, які хоць і не выносіў прыбор, але батарэйкі выняў з гэтай жа прычыны. Васіль Рамановіч лічыць такую меру бяспекі неабавязковай у сваім доме. І ніхто не мае права яго прымушаць. У яго і сапраўды печы, праводка, электрапрыборы ў парадку. І жыве ён цяпер не адзін, хоць мае адпаведны статус. Нядаўна, паводле яго слоў, прывёў у дом гаспадыню. Усё гэта добра, але хіба дадатковая мера перасцярогі бывае лішняй? На добры толк, апавяшчальнік павінен быць у кожным доме і кожнай кватэры незалежна ад узросту жыльцоў. Тым больш калі гаспадару ўжо семдзесят і ён мае праблемы са здароўем. На жаль, пакуль наша свядомасць крышку адстае ад тэмпаў развіцця выгод цывілізацыі. Кожны электрапрыбор сучаснай хатняй гаспадаркі тоіць у сабе нейкі працэнт небяспекі. Нездарма ж кажуць, што нельга нават мабільныя тэлефоны нанач пакідаць на зарадцы.

Удзельнікі рэйду — Аляксандр МЕЛЬНІК, Святлана ДАВІДЗЮК, Максім МРОЧКА.

ГРУПА РЫЗЫКІ

Асаблівую занепакоенасць у мясцовай улады і адпаведных органаў выклікаюць тыя, хто вызначаецца асацыяльнымі паводзінамі альбо злоўжывае алкаголем. Таму мы не маглі абмінуць дом Яўгена Уладзіміравіча Г. Хата яго размяшчаецца на самым рагу вуліцы, побач лес. А ў двары гаспадара расце проста казачных памераў елка. Калі б яе расквеціць агнямі пад свята, уся вёска бачыла б тую прыгажосць. Але гэты невялічкі двор з паламаным плотам, які ў любую пару года закрыты ценем векавога дрэва, упрыгожвае спецыфічны «ландшафт» — цэлая галерэя пустых бутэлек. **Прадстаўнік сельвыканкама Святлана ДАВІДЗЮК** расказвае, што печ і праводку гаспадару адрамантавалі за кошт мясцовага бюджэту. Перыядычна, хоць раз у паўгода, знаходзяцца валанцёры, якія крыху наводзяць парадак і выгружаюць з хаты амаль што воз смецця. Калі мы зайшлі ў дом, адразу адчулі холад, печ была не прапаленая. Гаспадар растлумачыў, што паліць яе не кожны дзень. У гаворку ён уступіў ахвотна, расказаў, што ў свой час працаваў нават на будоўлях БАМа. Толькі вось засталі мы гэтага «бамаўца» на ложку пад тым, што гадоў 40 назад было коўдрай, а цяпер уяўляе сабой дзіравыя рэзгіны. Падобна, што на абед у яго быў акраец сухога батона і вада ў кубку. Але 74-гадовага гаспадара ўсё задавальняе, ніякіх просьбаў альбо прэтэнзій ён не выказваў.

Супрацоўнік РАУС Аляксандр МЕЛЬНІК растлумачыў, што грамадзянін належыць да ціхіх і бяскрыўдных п'яніц, якія нікому, акрамя сябе, шкоды не робяць. У сацыяльную ўстанову ён ехаць адмаўляецца, бо на сваіх нагах. А ва ўстанову тыпу ЛПП яго ўжо не адправіш па ўзросце. Вось так і жыве чалавек ва ўзведзеным некалі бацькамі доме. Пенсію атрымлівае і тут жа пераводзіць яе ў «вадкі стан». Такім чынам, нашай рэйдавай групе давялося канстатаваць адлюстраванне яшчэ адной сацыяльнай праблемы грамадства.

> Асаблівую занепакоенасць у мясцовай улады і адпаведных органаў выклікаюць тыя, хто вызначаецца асацыяльнымі паводзінамі альбо злоўжывае алкаголем.

Паводле інфармацыі **начальніка Брэсцкага раённага аддзела МНС Вячаслава КАВАЛЬЧУКА**, сёлета ў раёне з пачаткам ацяпляльнага сезона назіраецца рост колькасці пажараў прыкладна на 31 працэнт. Значыць, прафілактыка будзе ўзмацняцца, рэйды працягнуцца.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Брэсцкі раён.

«Ландшафтны дызайн» аднаго гаспадара.

ПРАБЛЕМНАЕ ПЫТАННЕ

НЕ ДАРАЖЭЙ ЗА ЖЫЦЦЁ...

Ладна складзеная печка можа верна праслужыць не адзін дзясятак гадоў без асаблівых праблем. Аднак вечнага няма нічога, і нават ідэальна прыгнаная цэгла рана ці позна, але пачынае разбурацца. Спачатку гэта не вельмі заўважна, аднак калі праблема выявілася і нічога не рабіць, то фінал такога стаўлення будзе далёка не зайздросны.

Увогуле ж з пачатку года да 10 снежня ў сельскай мясцовасці Міншчыны адбылося 1152 пажары. Загінулі 102 чалавекі. Прычым такая прычына, як парушэнне правіл уладкавання, эксплуатацыі печак і іншых цеплагенерыравальных прылад, выбілася на другое месца. На яе долю прыйшлося крыху больш за чвэрць узгаранняў.

— Акцыя «За бяспеку разам», якая была скіравана на тое, каб праверыць стан пажарнай бяспекі ў старых, якія пражываюць адны, і ў шматдзетных сем'ях, праводзілася сёлета ў другой палове кастрычніка, — згадвае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — За тры тыдні ратавальнікі разам з прадстаўнікамі зацікаўленых ведамстваў — міністэрстваў унутраных спраў, працы і сацыяльнай абароны, энерганагляду і іншых — толькі па Мінскай вобласці наведалі больш за 70 тысяч домаўладанняў. Цікава, што 50 чалавек самі звярнуліся з просьбай праверыць, ці ў спраўным стане знаходзяцца ў іх печы і электраправодка.

Падчас абследавання жылых дамоў ратавальнікі знаходзілі шмат хіб, звязаных з правільнай эксплуатацыяй печак. Часцей за ўсё на падлозе не было металічнага перадтопачнага ліста. Комін не быў атынкаваны і пабелены. А справа ў тым, што калі кладка парушылася і дым пачынае выходзіць у жылое памяшканне, то ён «падфарбуе» праблемнае месца. Каштуе гэта не так і шмат, а вось як сродак дыягностыкі — неацэнна.

Сапсаваная кладка корпуса самой печы, дарэчы, таксама неаднаразова трапляла ў поле зроку камісій. Ад печак да комінаў не заўжды вытрымліваліся належныя проціпажарныя адступкі. На жаль, трывіяльным стала парушэнне правіл мантажу і эксплуатацыі электрасетак. Ратавальнікі таксама сутыкаліся з фактамі, калі ва ўжо ўстаноўленых аўтаномных пажарных апавяшчальніках адсутнічалі батарэйкі і каштоўны прыбор ператвараўся фактычна ў кавалак пластыку.

— Тым часам з пачатку года сігналы апавяшчальніка ўратавалі на тэрыторыі Мінскай вобласці 12 чалавек, — працягвае Анастасія Швайбовіч. — Паказальны выпадак адбыўся зусім нядаўна, 30 лістапада, у вёсцы Лежні Чэрвеньскага раёна. Прыкладна а трэцяй гадзіне дня на пульт дзяжурнага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях паступіў званок пра тое, што гарыць жылы дом. У гэты час там спаў гаспадар. Прачнуўшыся ад гуку апавяшчальніка, ён выйшаў самастойна. Агонь пашкодзіў сцены, перакрыцці столі і маёмасць. Меркаваная версія — неасцярожнасць пры курэнні...

За кожнай лічбай загінулых хаваецца не адна чалавечая трагедыя. Або няведанне, што рабіць. Разгледзім сітуацыю: ратавальнікі прыйшлі ў дом да адной бабулі падчас прафілактычнай акцыі і высветлілі, што з печкай не ўсё ў парадку. Наколькі складаны шлях давядзення яе да ладу?

— Перш за ўсё трэба адказаць на пытанне, ці ёсць у гэтага чалавека сваякі. Калі так, то ім мы адправім ліст, у якім будзе змешчана просьба прывесці дом да нармальнага проціпажарнага стану. Так, падчас акцыі «За бяспеку разам» сёлета работнікі МНС, сельвыканкамаў і тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ўжо выслалі больш за 600 такіх напамінаў.

Але што рабіць, калі сваякоў і родных у старога чалавека не засталося? У такім разе інфармацыя накіроўваецца ў мясцовыя органы ўлады і тэрытарыяльнай абароны насельніцтва. Таксама за бюджэтныя сродкі паставяць і аўтаномны пажарны апавяшчальнік.

Як жа ў рамонце печы дапамагаюць сацыяльныя ўстановы? З гэтым пытаннем карэспандэнт «МС» звярнуўся да **намесніка дырэктара Салігорскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ларысы ЖУКАВАЙ.**

— Калі пенсіянер знаходзіцца на нашым абслугоўванні, то праблему з печкай заўважыць сацыяльны работнік. Таксама ў нас дзейнічаюць аглядныя камісіі, якія ствараюцца з прадстаўнікоў многіх органаў. Яны перыядычна абыходзяць дамы, дзе пражываюць уразлівыя катэгорыі грамадзян, — гэта старыя, якія жывуць адны, і шматдзетныя сем'і. Калі выяўляюцца нейкія праблемы, то яны ўключаюцца ў графік рамонту, які зацвярджаецца штогод. Работы мы звычайна выконваем у першай палове года. Праўда, і тут ёсць адно «але»: калі патрабуецца невялікі рамонт і печку трэба проста крыху падмазаць растворам, то тады аказваецца матэрыяльная дапамога са сродкаў фонду і гэта робіцца ўласнымі сіламі. З больш паглыбленым рамонтам складаней. Ён вымагае большых сродкаў і, адпаведна, складання плана-графіка.

> За тры тыдні ратавальнікі разам з прадстаўнікамі зацікаўленых ведамстваў — міністэрстваў унутраных спраў, працы і сацыяльнай абароны, энерганагляду і іншых — толькі па Мінскай вобласці наведалі больш за 70 тысяч домаўладанняў.

— Колькі часу праходзіць пасля ўключэння ў план-графік да рамонту печкі?

— Звычайна мы гэтыя работы выконваем у другім-трэцім квартале. Акрамя таго, мы просім і прадпрыемствы, размешчаныя на тэрыторыі сельсаветаў, дапамагчы сваім былым супрацоўнікам. Радуе, што яны адгукаюцца. Але зноў жа, сродкі мы знайшлі, а дзе ўзяць спецыяліста, які мае адпаведную кваліфікацыю? Мы абавязкова робім аб'яву на электроннай пляцоўцы і абвяшчаем тэндар. Праблем з гэтым няма, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія працуюць печнікамі, адгукаюцца вельмі ахвотна.

Сёлета такім чынам у Салігорскім раёне дапамаглі адрамантаваць печы ў сямідзесяці дамах.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

СІТУАЦЫЯ

Дакуль гарэць будзем?

На сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў прааналізавалі работу аглядных камісій

Як павысіць эфектыўнасць работы аглядных камісій, стварыць бяспечныя ўмовы для пражывання грамадзян, абмеркавалі ўдзельнікі чарговай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. Пытанне даволі актуальнае з улікам той пажарнай сітуацыі, якая складваецца на Міншчыне.

Сёлета за адзінаццаць месяцаў у цэнтральным рэгіёне адбылося 1459 пажараў, што на 287 больш, чым за аналагічны перыяд летась, загінулі 126 чалавек — на 15 больш. Асноўныя прычыны, якія спрыяюць росту пажараў і гібелі людзей, агучыў **начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Сяргей ЛАПАНОВІЧ.** Гэта — неасцярожнае абыходжанне з агнём — 475 пажараў (32 %), парушэнне правіл уладкавання або эксплуатацыі пячнога ацяплення і цеплагенерыравальных агрэгатаў — 382 пажары (25 %), парушэнне правіл уладкавання або эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання — 243 пажары (16,4 %). Прычым 90 % пажараў адбылося ў жыллёвым фондзе. У аўтсайдарах па гібелі людзей на пажарах Пухавіцкі і Барысаўскі раёны. Вядома, яны самыя густанаселеныя. Але гэтыя абставіны не могуць быць апраўданнем, паколькі на Барысаўшчыне ахвярамі агню сталі цэлыя сем'і.

У ноч на адзінаццатага студзеня 2018-га ў вёсцы Стайкі Барысаўскага раёна ў выніку ўзгарання жылога дома загінулі пяць чалавек. Сярод вяскоўцаў гэты дом набыў славу прытона. А ці ведалі пра гэта адпаведныя службы?

Сямнаццатага лістапада ў вёсцы Навасёлкі ў агні загінулі 93-гадовая пенсіянерка і яе сын. Мужчына перыядычна злоўжываў спіртным, курыў, у момант пажару быў нецвярозы. Папярэдне двойчы сям'ю наведвалі спецыялісты Барысаўскага райвыканкама, але абмежаваліся толькі рэкамендацыямі аб правядзенні рамонту печы і электраабсталявання.

Дваццаць чацвёртага лістапада ў вёсцы Навасады Барысаўскага раёна загарэўся жылы дом, у выніку — дзве смерці. Муж і жонка — пенсіянеры. Прычына — неасцярожнае абыходжанне з агнём, канстатаваў Сяргей Лапановіч. Гэтыя грамадзяне былі пастаўлены на ўлік адзінока пражываючых, але аглядная камісія іх не наведвала.

Дваццаць пятага кастрычніка ў Барысаўскім раёне загінуў грамадзянін 1971 года нараджэння. Ён злоўжываў алкаголем, у доме часта збіраліся кампаніі такіх жа аматараў спіртнога. Але гэты факт застаўся па-за ўвагай аглядной камісіі.

Карэспандэнт «МС» спрабавала высветліць у раённым аддзеле Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, чаму склалася такая сітуацыя. Але атрымала катэгарычную адмову ад каментарыяў. І вось у гэты ж дзень, чацвёртага снежня пасля абеду, у Барысаве зноў ушчэнт разбураны жылы дом па вуліцы Адамовіча. Па папярэдняй версіі ўзарваўся кацёл. Гаспадар атрымаў апёкі і шпіталізаваны ў бальніцу.

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ, які прыняў удзел у пасяджэнні сесіі, спытаў у аднаго са старшынь сельвыканкама Барысаўскага раёна, колькі на тэрыторыі сельсавета адзінокіх, адзінока пражываючых; сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы; грамадзян, што злоўжываюць спіртным. Але атрымаў агульныя тлумачэнні: мы выяўляем парушэнні пры эксплуатацыі пячнога ацяплення, электраабсталявання, трымаем на кантролі неўладкаваныя сем'і.

— Выявіць недастаткова, неабходна дабівацца ліквідацыі недахопаў, — рэзюмаваў Ігар Яўсееў.

— Якія захады робяцца, каб нармалізаваць пажарную сітуацыю? — пацікавіўся памочнік Прэзідэнта ў **начальніка Барысаўскага райаддзела МНС Уладзіміра ПІКУЗЫ.**

— У першай палове дня падводзім вынікі, на нарадзе ў старшыні райвыканкама ставім задачы аглядным камісіям, ладзім розныя акцыі, — такі быў адказ.

На думку Сяргея Лапановіча, аглядныя камісіі не могуць дасканала абследаваць кожную катэгорыю грамадзян. Але наведаць, убачыць тую ці іншую праблему трэба. Прычым неабходна праінфармаваць аб недахопах органы ўнутраных спраў, аховы здароўя, МНС, камітэта па працы і сацыяльнай абароне. Для таго, каб можна было прыняць меры, папрацаваць індывідуальна з кожнай катэгорыяй грамадзян і не даводзіць да трагедыі. «Мы неаднаразова абазначалі гэтую праблему, — сказаў Сяргей Васілевіч, — але, на жаль, на наша папярэджанне слаба рэагавалі».

Характэрныя недахопы, якія былі выяўлены пры вывучэнні дзейнасці аглядных камісій, агучаны на пасяджэнні. У іх склад не ўключаюцца ўсе зацікаўленыя суб'екты прафілактыкі, склад не абнаўляецца, план работы не распрацоўваецца або штогод рыхтуецца па шаблоне, фармальна, не карэктуецца. Сёння, паводле нарматыўна-прававых актаў, трэба наведваць сем'і як мінімум два разы на год. Але ў тых, дзе бацькі п'юць, вядуць асацыяльны лад жыцця, а дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, магчыма, трэба бываць і кожны тыдзень у залежнасці ад сітуацыі.

На сесіі агучылі і станоўчыя прыклады работы камісій. **Старшыня Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ШЭСТАЛЬ** расказаў, што за кошт усіх суб'ектаў гаспадарання адрамантавалі печы ў сямі домаўладаннях, электраправодку — у шасці. З падтрымкай дзяржавы праведзены рамонт печаў у 26 дамах грамадзян сацыяльнай катэгорыі, у 29 — заменена электраабсталяванне, у 90 устаноўлены пажарныя апавяшчальнікі, у шасці дамах шматдзетных сем'яў яны выведзены на вуліцу. Аднак, як лічыць Сяргей Яўгенавіч, гэтага недастаткова. У выніку абследавання сацыяльных катэгорый грамадзян выяўлена вялікая колькасць дамоў з пячным ацяпленнем, дзе канструкцыі састарэлі і не адпавядаюць цяперашнім патрабаванням супрацьпажарнай бяспекі. Для ўладкавання нават самай простай печы неабходна 1,5 тысячы рублёў. Такіх грошай у большасці няма. У раённых бюджэтах таксама недастаткова сродкаў на гэтыя мэты. Для вырашэння праблемы Сяргей Шэсталь прапанаваў разгледзець пытанне аб выдзяленні льготных крэдытаў для сацыяльна неабароненых грамадзян. Акрамя таго, на яго думку, павысіць выніковасць работы аглядных камісій і суб'ектаў прафілактыкі, аптымізаваць дакументаабарот дазволіла б стварэнне адзінай электроннай базы. У банку даных павінны змяшчацца звесткі аб праведзеных абследаваннях, выяўленых парушэннях, прынятых мерах па ліквідацыі недахопаў.

Прапанову падтрымала **старшыня Бараўлянскага сельвыканкама Жанна ВАРАБЕЙ.** Акрамя таго, па яе словах, большасць членаў аглядных камісій — дзяўчаты і жанчыны. Не заўсёды яны могуць трапіць у тую ці іншую кватэру без прысутнасці прадстаўнікоў органаў унутраных спраў або аддзела па надзвычайных сітуацыях. На апошнім пасяджэнні Бараўлянскага сельвыканкама з прадстаўнікамі МНС знайшлі выхад. А менавіта — прыцягваць курсантаў для сумеснага наведвання і абследавання домаўладанняў. Разам з тым Жанна Варабей спынілася і на іншых праблемных момантах. У прыватнасці, у многіх уласнікаў элементарна не хапае грошай, каб прывесці жыллё ў бяспечны стан. Магчымы выхад з сітуацыі — гэта падключэнне да вырашэння пытання суб'ектаў гаспадарання, дзе працуюць або працавалі гэтыя людзі, магчыма і спонсараў. Сёння цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва забяспечвае бясплатна аўтаматычнымі пажарнымі апавяшчальнікамі шматдзетныя сем'і за кошт бюджэтных сродкаў. На тэрыторыі Бараўлянскага сельсавета пражывае 536 такіх сем'яў. Але большасць з іх мае дастаткова добры ўзровень жыцця і дастатак. І вядома, маглі б набыць апавяшчальнік за ўласныя сродкі. «Магчыма, ёсць рэзон перагледзець пераразмеркаванне сродкаў дзяржаўнай праграмы і накіраваць іх на менш забяспечаныя катэгорыі грамадзян, сем'і, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, адзінокім людзям.

Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ, падводзячы вынікі сесіі, адзначыла: «Мы будзем актыўна займацца праблемай пажараў, мяркую, агульнымі намаганнямі сітуацыю выправім».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

НА СЛЫХУ

ШТО НОВАГА Ў ДЭКРЭЦЕ № 3

Хто не будзе аплачваць «камуналку» па поўнай?

Пашырыўся пералік тых, каго не будуць уключаць у базу даных не занятых у эканоміцы грамадзян. Змены прапісаны ў пастанове Саўміна ад 8 снежня 2018 года № 881.

Так, акрамя выпадкаў, агучаных уладамі раней, утрыманцамі не будуць лічыцца ўласнікі маёмасці (заснавальнікі, удзельнікі) камерцыйных арганізацый, за выключэннем акцыянерных таварыстваў. Не ўзнікне пытанняў да сужэнцаў маладых рабочых (служачых), якія прыступілі да работы па размеркаванні ці накіраванні ў мясцовасць, дзе напружаная сітуацыя з працаўладкаваннем. Раней такая норма датычылася толькі мужоў і жонак маладых спецыялістаў. Сужэнцы дыпламатаў, якія знаходзяцца за мяжой, таксама не трапяць у спісы незанятых.

Не будуць уносіць у базы тых, хто знаходзіцца пад дыспансерным наглядам з-за хранічных ці зацяжных псіхічных захворванняў. Але гэта не распаўсюджваецца на грамадзян з сіндромам залежнасці ад алкаголю, наркотыкаў ці таксічных рэчываў.

Тым, каму да пенсіі застаецца год, таксама няма падстаў хвалявацца. Пры фарміраванні базы за першае паўгоддзе ў яе не будуць уключаць грамадзян, якія на 1 студзеня наступнага года дасягнуць агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, за другое паўгоддзе — тых, каму выходзіць на пенсію 1 ліпеня наступнага года. Падлеткі, маладзейшыя за 18 гадоў, у спіс незанятых таксама не ўносяцца.

У базе будзе больш інфармацыі аб утрыманцах, чым заяўлялася раней. Напрыклад, туды занясуць звесткі пра дату прызнання недзеяздольным, ідэнтыфікацыйны нумар і дату нараджэння дзіцяці, даты пазбаўлення бацькоўскіх правоў і аднаўлення ў іх.

Даведвацца пра тое, што трэба аплаціць паслугі ЖКГ па поўным тарыфе, незанятыя жыхары краіны будуць праз свае жыроўкі.

У краіне створаць таксама адзіную базу даных грамадзян, якія навучаюцца. Весці яе будзе галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЦІ НАБУДУЦЬ У ГАСПАДАРОЎ СТАРЫЯ ХАТЫ?

МЯСЦОВЫЯ ўлады пачалі «прымерваць» адноўлены і дапрацаваны Указ № 357 «Аб пустуючых і старых дамах», які ўступіў у сілу 7 снежня.

Хоць стары, але не танны...

Адэльскі сельскі савет, што ў Гродзенскім раёне, можна назваць брамай у Еўрасаюз. На яго тэрыторыі знаходзіцца і пункт пропуску «Брузгі» — адзін з самых буйных пагранпераходаў рэспублікі. Вядома, замежнікі заўважаюць у першую чаргу стан дарог і наваколля, у тым ліку старыя сядзібы.

Сёлета тут знеслі дзевяць спарахнелых дамоў, але працэс гэты даволі працяглы, можа заняць некалькі гадоў, зазначае **старшыня Адэльскага сельсавета Уладзімір ТРУТНЕЎ.** З новым указам тут звязваюць значныя спадзяванні. У прыватнасці, па спрашчэнні працэдуры адчужэння. Згодна з дакументам, працэс паскорыцца ў некалькі разоў. А гэта, у сваю чаргу, дазволіць скараціць і бюджэтныя выдаткі.

— У нас ёсць такі дом, але мы яго не зносім, а будзем спрабаваць, згодна з новым указам, яго прадаць. На практыцы «абкатаем» новую працэдуру і паглядзім, як гэты працэс пойдзе далей, пачнём адразу пасля Новага года, — кажа суразмоўнік.

> Безгаспадарныя пабудовы ствараюць і пажарную небяспеку. Па даных Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, сёлета ў рэгіёне адбылося 36 пажараў у такіх кінутых пабудовах.

Каб прызнаць дом безгаспадарным, патрэбна 3-4 месяцы. Большую частку займае падрыхтоўчая работа, бо ў ёй задзейнічана некалькі службаў, выязджае спецыяльная камісія. Бывае, што доўгі час вядзецца пошук нашчадкаў, якія павінны пісьмова пацвердзіць, ці будуць жыць у гэтым доме. Спрыяльным фактарам з'яўляецца адмова нашчадкаў ад уладання домам. Гэта спрашчае работу па зносе старых дамоў. Але паўстае праблема продажу ўчастка.

— Вось мы нядаўна ў Адэльску знеслі дом, скасілі траву, выкарчавалі дрэвы. Але мы не можам участак выставіць на аўкцыён. Калі гэта аграгарадок, патрэбны генеральны план забудовы, а ў нас яго няма, і яго трэба распрацаваць. А гэта вельмі вялікія грошы. У звычайнай вёсцы можна распрацаваць проста схему землеўпарадкавання, але і гэта работа патрабуе значных затрат. Мы распрацавалі тры ўчасткі, што нам абышлося ў 30 тысяч рублёў, — расказаў Уладзімір Трутнеў.

Традыцыйна высокі попыт на ўчастку захоўваецца ў вёсцы Брузгі, што на беларуска-польскім пагранічча. Тут створана добрая інфраструктура: газ, водаправод, добрыя дарогі. У першую чаргу ўчасткі выдзяляюцца тым, хто мае патрэбу. Зараз будуць спрабаваць прадаць праз аўкцыён безгаспадарныя дамы. Пакуль ахвотных няма. Кошт стартуе з 6 тысяч рублёў. Згодна з указам, цана з кожным аўкцыёнам павінна зніжацца.

У Адэльску спрабуюць падключыць тых гаспадароў, якія за ўласныя сродкі арганізуюць знос трухлявага будынка, у выніку чаго становяцца ўладальнікамі ўчастка пад будаўніцтва свайго дома. Такі кірунак старшыня сельскага Савета лічыць найбольш перспектыўным.

> Звязваюць значныя спадзяванні. У прыватнасці, па спрашчэнні працэдуры адчужэння. Згодна з дакументам, працэс паскорыцца ў некалькі разоў. А гэта, у сваю чаргу, дазволіць скараціць і бюджэтныя выдаткі.

Каб не трапіць у пастку

Сітуацыя са старымі і безгаспадарнымі дамамі няпростая, таму і работа вядзецца марудна, і нарматыўная база пастаянна карэктуецца. Па словах **спецыяліста Індурскага сельскага Савета Алены РАДЫЁН,** паспешныя рашэнні могуць прывесці да канфлікту. Жанчына прыгадала выпадак, які нядаўна адбыўся ў адным з сельскіх Саветаў Гродзенскага раёна, калі мясцовыя ўлады прадалі па спрошчанай схеме дом, але пакупнік не можа зарэгістраваць яго ў БТІ і стаць уладальнікам па той прычыне, што дом не стаяў на балансе сельскага Савета. Новы ўказ, па словах Алены Радыён, не патрабуе такой працэдуры. Вось і дом, які тут збіраюцца прадаваць, не зарэгістраваны ў БТІ.

— Гэты кірунак патрабуе больш спрошчанай схемы, — упэўнена спецыяліст сельскага Савета. — Мясцовай уладзе патрэбна больш паўнамоцтваў у гэтых пытаннях, таму што афармленне дакументаў, пастаноўка на баланс абыходзіцца нятанна. Усе дадаткі не абгрунтаваны. Кошт на афармленне дакументаў перавышае кошт дома. А калі ісці па спрошчанай схеме і не афармляць дакументаў, можна трапіць у заканадаўчую пастку. Гэты вопыт таксама трэба ўлічваць.

Пакуль у Індуры плануюць выставіць на аўкцыён адзін дом. Каб зрабіць апошні дакумент, атрымаць пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі, трэба заключэнне Гродзенскага райвыканкама аб магчымасці выкарыстоўваць гэты дом як жылы. Але і гэта працэдура чамусьці займае працяглы час.

— Мы маглі б прадаць тры дамы, і быццам бы ёсць ахвотныя іх набыць, але ўсё балансуе на стадыі дакументаў: што патрэбна, а што — не. Трэба ўлічваць усе выпадкі развіцця падзей, — кажа спецыяліст сельскага Савета.

Літоўскі «след» старой сядзібы

У Воранаўскім раёне дадзены даручэнні кожнаму сельскаму Савету правесці на тэрыторыі рэвізію і ўдакладніць, колькі пустуючых дамоў знесена, колькі прададзена, колькі перададзена «ў добрыя рукі». Па словах **Алены ДАНЕВІЧ,** якая сёлета была абрана старшынёй райсавета, гэта тэма будзе мець адзін з прыярытэтных кірункаў.

— Для нас гэта тэма вельмі актуальная, — кажа старшыня райсавета. — У раёне шмат хутароў, многія з якіх пустыя. Мы многае паспелі зрабіць падчас Года добраўпарадкавання на зямлі. Добрыя зрухі зроблены і сёлета, у Год малой радзімы.

Ёсць у раёне і сельсаветы-лідары, дзе гэту работу можна лічыць узорнай. Так, у Канвелішкаўскім сельскім Савеце толькі сёлета знесена 10 аб'ектаў — два старыя дамы і восем фундаментаў. Землі перайшлі ва ўладанне сельскіх гасгаспадарак.

Работу ў гэтым кірунку варта працягваць, лічыць Алена Янаўна. І добрая дапамога — новы Указ № 357, згодна з якім мясцовыя ўлады маюць магчымасць скараціць тэрмін уцягвання бясгаспадарнага дома ў абарот. Гэта датычыцца і пошуку гаспадара. Калі, напрыклад, уласнік праз азначаны тэрмін не адгукнуўся, дом рыхтуецца альбо на продаж, альбо пад знос. Такія меры распаўсюджаны на тую катэгорыю грамадзян, якія доўгі час не заяўляюць аб сабе, з'ехалі за мяжу, напрыклад у суседнюю Літву. А дом у гэты час нагадвае нейкія руіны. Ёсць варыянты, калі ўласніка знайшлі, але ён не мае намеру клапаціцца аб старой сядзібе.

— У такім выпадку мы можам гэты дом па згодзе ўласніка выставіць на продаж. Дастаткова проста дамовіцца і правесці працэдуру належным чынам: гэта можа быць аўкцыён альбо прамы продаж, — кажа Алена Даневіч.

Вядома, для раёна выгадней прадаць дамы. Магчыма, гэта магло б зацікавіць і пакупнікоў. Ва усялякім разе, райсавет актыўна апавяшчае аб гэтым вяскоўцаў падчас сходаў, інфармуе праз СМІ. Алена Янаўна з аптымізмам зазначае: калі дом прыдатны для жыцця і даступны па кошце, яго могуць купіць.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Ігар ЛЯБЕЦКІ, старшыня Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў:

— У раёне каля дзясятка сядзіб можна выстаўляць на продаж. Прадалі пакуль толькі адну. Новы ўказ дазволіць прадаваць па больш спрошчанай схеме: праз аўкцыён з паніжэннем кошту альбо напрамую. У дадзенай сітуацыі трэба выкарыстоўваць усе магчымасці, каб палепшыць сітуацыю з безгаспадарнымі дамамі. Калі «абкатаем» гэту працэдуру, справа пойдзе хутчэй. Зараз даводзіцца траціць грошы на знос, распрацоўку ўчастка, каб яго прадаць. Значна выгадней прадаць дом. Рыхтуюцца на продаж дамы ў Скідзелі, Сапоцкінскім і Індурскім сельскім Саветах. Першапачатковы кошт — ад трох да пяці тысяч рублёў.

У некаторых вёсках дамы павінны праходзіць толькі праз аўкцыён, у аддаленых населеных пунктах будзе дзейнічаць заяўляльны прынцып. І мясцовая ўлада мае паўнамоцтвы на продаж такога дома па азначаным кошце. Такая схема ўжо складзена. Варта адзначыць, што ацэньваецца толькі пабудова, зямлю пакупнік набывае без аўкцыёна. Таксама ёсць магчымасць атрымаць зямельны участак з умовай самастойнага зносу.

У ТЭМУ

Безгаспадарныя пабудовы ствараюць і пажарную небяспеку. Па даных Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, сёлета ў рэгіёне адбылося 36 пажараў у такіх кінутых пабудовах. Зімой рызыка ўзгарання значна ўзрастае: тут знаходзяць прытулак грамадзяне, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Нярэдка такія зборы прыводзяць да пажару.

А БАТАРЭЙКІ — У СПЕЦЫЯЛЬНЫ КАНТЭЙНЕР

Падводзім вынікі нашай трэцяй апытанкі на экалагічную тэму

У першым пытанні мы папрасілі чытачоў адказаць, якія ж віды адходаў яны сартуюць. Большасць рэспандэнтаў раздзяляюць паперу, пластык, шкло і небяспечнае смецце — батарэйкі і ртутныя лампы. Такіх назбіралася прыкладна 2/3. Крыху меней людзей сартуюць метал і старыя рэчы. А дваццаць працэнтаў рэспандэнтаў займаюцца гэтым у дачыненні да арганічных адходаў — травы і старога лісця.

Пільныя чытачы заўважаць, што калі скласці гэтыя лічбы, то атрымаецца перавышэнне ста працэнтаў. Усё правільна: справа ў тым, што гэтае пытанне прадугледжвала магчымасць некалькіх варыянтаў адказу.

А вось наступны вынік прыемна парадаваў. Тры чвэрці рэспандэнтаў стараюцца выкарыстоўваць чыстыя пакеты некалькі разоў. Шостая частка апытаных і ўвогуле карыстаецца торбамі, зробленымі з экалагічна чыстых матэрыялаў.

Яшчэ адзін важны аспект — правільная ўтылізацыя адпрацаваных батарэек. Гэты металічны цыліндр змяшчае ў сабе шмат цяжкіх і шкодных металаў, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе: свінец, нікель, цынк, марганец, кадмій. Адна батарэйка можа забрудзіць да дваццаці квадратных метраў тэрыторыі!

Некалькі гадоў таму ў гандлёвых пунктах пачалі з'яўляцца спецыяльныя кантэйнеры, у якія можна выкінуць нерабочыя батарэйкі. І гэта прынесла свае вынікі: тры чвэрці ўдзельнікаў апытання выбіраюць менавіта такі шлях пазбаўлення ад небяспечнага смецця. А 8 % апытаных стараюцца карыстацца акумулятарамі, якія можна перазарадзіць дзясяткі разоў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Наш інтэрактыўны праект з чытачамі працягваецца. Даведацца, наколькі мы «экасвядомыя», можна з нашай новай апытанкі

1. Ці лічыце вы, што за несартаванне смецця трэба ўводзіць сістэму штрафаў?

☐ Так, гэтая мера палепшыць экалогію ў горадзе/краіне/свеце.

☐ Не. Няхай пра гэта думае дзяржава.

☐ Гэта заўчасная мера. Калі будзе ў кожным дварэ дастатковая колькасць кантэйнераў для сартавання смецця, тады пра гэта можна гаварыць.

2. Ці трэба заахвочваць грамадзян за разабранае смецце?

☐ Так, гэта будзе стымуляваць людзей сартаваць смецце.

☐ Не, гэта справа сумлення кожнага.

3. Якую сыравіну вы звычайна здаяце і атрымліваеце за гэта грошы?

☐ Макулатура.

☐ Поліэтылен, ПЭТ-бутэлькі.

☐ Шклатара.

☐ Зношаныя шыны.

☐ Лом чорных/каляровых металаў.

☐ Тэкстыль.

☐ Бытавая тэхніка.

☐ Адпрацаваная аліва.

☐ Ртутныя лямпы, батарэйкі.

4. У якім населеным пункце вы жывяце?

☐ Мегаполіс (сталіца, абласны горад).

☐ Невялікі раённы горад.

☐ Пасёлак, аграгарадок, вёска.

5. Узрост

☐ 15—20 гадоў.

☐ 20—30 гадоў.

☐ 30—45 гадоў.

☐ 45—60 гадоў.

☐ 60+.

Скарыстайцеся сваім смартфонам, каб адсканаваць QR-код і прыняць удзел у апытанцы.

ТЭХНАЛОГІІ ЛЮБЯЦЬ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

АГУЛЬНАЯ СПРАВА

Як Браслаў стаў безвугляроднай сталіцай Беларусі?

Тры гады таму гэты раён паставіў сабе за мэту стаць кліматычна нейтральным муніцыпалітэтам. Рэцэпт «стравы» — сучасныя тэхналогіі плюс супрацоўніцтва мясцовай улады з грамадскасцю.

У 2014 годзе Браслаўскі раён падпісаў «Пагадненне мэраў па кліматэ і энергіі». З гэтага часу тут рэалізуюцца розныя мерапрыемствы і праекты, накіраваныя на павышэнне энергаэфектыўнасці рэгіянальнай эканомікі. Сёлета завяршаецца адзін з іх — праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Браслаўскі раён — першы кліматычна нейтральны муніцыпалітэт у Беларусі». Ён фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Браслаўскім райвыканкамам, установай «Цэнтр экалагічных рашэнняў» (ЦЭР) і КУП ЖКГ «Браслаў-камунальнік». Што атрымалася зрабіць за гэты час, каб наблізіцца да жаданай мэты?

«Зялёнае» цяпло

Рэканструкцыя кацельні ЦМУ (ТМО) КУП ЖКГ «Браслаў-камунальнік» стала адным з асноўных мерапрыемстваў праекта. Гэты аб'ект забяспечвае цяплом і гарачай вадой адзін з мікрараёнаў горада, дзе размешчаны каля 30 аб'ектаў, у тым ліку Браслаўская цэнтральная раённая бальніца, адміністрацыйныя будынкі і жылы фонд.

У межах праекта ў кацельні прайшла рэканструкцыя, было заменена абсталяванне, устаноўлены сучасныя і эфектыўныя катлы магутнасцю 3,1 і 0,5 МВт, якія працуюць на дранцы (адходах вытворчасці).

— На рэканструкцыю аб'екта было выдаткавана каля 2 мільёна рублёў, — расказаў **дырэктар КУП ЖКГ «Браслаў-камунальнік» Пётр БЯЛУСЬ.** — Сродкі выдзяляліся з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў, а таксама за кошт міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Новыя катлы ў стане забяспечыць работу як падчас пікавай нагрузкі ў зімовы перыяд, так і летам толькі для падачы гарачага водазабеспячэння.

Рэканструяваная кацельня дапаможа раёну скараціць выкарыстанне імпартаванага прыроднага газу і палепшыць якасць спальвання мясцовых відаў паліва. Акрамя таго, амаль у два разы (з 35,1 да 19,2 тоны ў год) зменшацца і выкіды забруджвальных рэчываў.

Ліхтары на сонечных батарэях

Дзякуючы рэалізацыі праекта ўдалося скараціць і энергаспажыванне ў Браславе за кошт устаноўкі энергаэфектыўных святлодыёдных лямпаў на дзвюх вуліцах горада. А каля набярэжнай возера Дрывяты, дзе знаходзіцца адно з папулярных месцаў адпачынку, з'явіліся ліхтары на сонечных батарэях. Гэта невялікі папулярызацыйны праект, прысвечаны сучасным тэхналогіям.

— На кожным ліхтары са святлодыёднымі лямпамі ўсталявана сонечная панэль магутнасцю 240 ват, — расказвае **супрацоўнік энергетычнай праграмы ЦЭР Уладзімір РАК.** — Днём энергія, што выпрацоўваюць панэлі, перадаецца на акумулятар, ад якога і працуюць лямпы ў цёмны час сутак. І нават снежаньскага сонца хапае, каб асвятляць гэты ўчастак на працягу ўсёй ночы: панэль дастаткова вялікая, а святлодыёдныя лямпы спажываюць мала (каля 30 ват).

Сонечны калектар у дзіцячым садзе

З яго дапамогай установа адукацыі эканоміць электрычнасць на падаграванні вады і вучыць дзетак асновам энергазберажэння.

Па словах **каардынатара праекта ад ЦЭР Дзмітрыя БУРОНКІНА,** працаваць на гэтым аб'екце давялося шмат, і ў першую чаргу з-за вялікай адказнасці перад юнымі жыхарамі Браслава: аўтары доўга займаліся праектнай дакументацыяй, энергетычнымі аўдытамі, абмяркоўвалі ўстаноўку кожнага клапана, вентыля.

Параўнальныя даныя за сёлетні і леташні кастрычнік паказваюць: сістэма награвання вады з дапамогай сонечных калектараў закрывае палову спажывання электрабойлера. Агульная ж эканомія павінна скласці да 8,9 МВт·г у год.

— Сонечныя калектары дазваляюць істотна эканоміць: летам мы не ўключалі электраводанагравальнікі, — адзначыла **загадчык ДУА «Яслі-сад № 1 г. Браслава» Вольга ШЫМУКОВІЧ.**

Разам з устаноўкай калектараў праходзілі і шматлікія заняткі з выхаванцамі сада і іх бацькамі. Цяпер дзеці шмат ведаюць пра сонечную і геатэрмальную энергію, а таксама як яны дапамагаюць эканоміць прыродныя рэсурсы.

Акрамя таго, у межах праекта ўсталявалі пасудамыечную машыну, абсталяванне для эканоміі (змешвальнікі, аэратары і г. д.), а ў хуткім часе могуць з'явіцца параканвектаматы і іншыя прылады для кухні.

Турызм і энергазберажэнне ідуць побач

Па словах **старшыні Браслаўскага райвыканкама Аляксандра БАДАНІНА,** рэалізацыя гэтага і іншых праектаў дазваляе дасягнуць галоўнай мэты: стварыць камфортнае асяроддзе для жыхароў рэгіёна, захаваўшы чыстай мясцовую прыроду. А гэта магчыма праз змяншэнне выкідаў CO_2.

— Рэалізацыя праекта дазволіла нам гэта зрабіць, і гэта добры прыклад для грамадства, — падкрэсліў Аляксандр Баданін. — Па папярэдніх даных, у шматлікіх мерапрыемствах за апошні час прынялі ўдзел больш за 4000 жыхароў раёна.

У межах праекта была таксама распрацавана Стратэгія дасягнення кліматычнай нейтральнасці Браслаўскага раёна, дзе стаўка робіцца на ўдасканаленне энергетычнага сектара, укараненне аднаўляльных крыніц энергіі, актывізацыю энергазберажэння, развіццё арганічнай сельскай гаспадаркі, турызму (у тым ліку і аграэкатурызму) і стварэнне ў гэтых сферах новых рабочых месцаў.

Вераніка КОЛАСАВА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 13 снежня 2018 года.**